16+

Ліm

# Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 13 (5222) 31 сакавіка 2023 г.

ISSN 0024-4686




*Не збочыць з творчага шляху стар. 5*



*Урадлівасць, багацце, энергія стар.12*



*Спектаклі, якія лечаць стар. 14*

# Найлепшыя ўзоры кнігадруку




*Калаж Кастуся Дробава.*

У нядзелю завяршыла работу XXX Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш. Падчас цырымоніі закрыцця, 26 сакавіка, арганізатары падзяліліся статыстыкай і падвялі вынікі. Так, па словах выканаўчага дырэктара форуму Дзмітрыя Макарава, цягам пяці дзён Нацыянальны выставачны цэнтр «БелЭкспа» наведалі больш за 50 тысяч чалавек. На юбілейную выстаўку, якая праходзіла пад слоганам «Свет кнігі без меж», у беларускую сталіцу прыехалі дэлегацыі з 19 краін. Па гэтым паказчыку сёлетні форум значна пераўзыходзіць мінулагодні. Місію цэнтральнага экспанента і пачэснага госця з гонарам пранесла Расійская Федэрацыя: выкладка краіны-суседкі, прадстаўленая ў Мінску, уражвала сваімі маштабамі.

Зрэшты, іншыя ўдзельнікі, якіх гэтым разам набралася больш за 430, таксама не адставалі. Адмысловыя забаўляльныя і пазнавальныя імпрэзы сустракалі наведвальнікаў каля кожнага стэнда. Амаль беcперапынна на працягу ўсіх пяці дзён працавала і платформа для прэзентацый. А колькі афіцыйных мерапрыемстваў і конкурсаў за гэты час было праведзена арганізатарамі, у чыіх шэрагах першымі называюцца Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь і ВК ТАА «Макбел», — не злічыць! Бадай, найбольшую ўвагу грамадскасці прыцягнула падвядзенне вынікаў конкурсу «Мастацтва кнігі» — традыцыйнага, ужо 62-га па ліку, спаборніцтва айчынных выдаўцоў, арганізатарам якога выступае Міністэрства інфармацыі.

**Працяг на стар. 4 ▸**

## «ЛіМ»-акцэнты

**Навука.** Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам Кангрэса маладых вучоных Беларусі і Расіі. «Навука — апора дзяржавы ў стварэнні моцнай эканомікі, фарміраванні гуманітарнай прасторы, заснаванай на пераемнасці спрадвечных духоўна-маральных арыенціраў, — гаворыцца ў прывітанні. — Мэты навуковага пошуку вызначае час. Ва ўмовах складанага пераплецення і канфлікту інтарэсаў транснацыянальных карпарацый і міжнародных інтэграцыйных блокаў менавіта вам, маладым вучоным, трэба будзе вырашаць найважнейшыя задачы па абароне нацыянальных інтарэсаў Беларусі і Расіі, адзіных у сваім імкненні да захавання братэрскіх сувязей паміж славянскімі народамі, беражлівага стаўлення да гістарычнай памяці і стварэння справядлівага глабальнага свету». Кіраўнік дзяржавы адзначыў сімвалізм таго, што першы Кангрэс маладых вучоных Беларусі і Расіі праводзіцца на беларускай зямлі ў Год міру і стваральнай працы.

**Віншаванне.** Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага артыста Расіі Аляксандра Міту з 90-годдзем. «Ваша жыццё — прыклад нястомнага служэння мастацтву. Вы рэалізавалі мноства яркіх, запамінальных кінематаграфічных работ, якія сталі ўзорам найвышэйшага прафесіяналізму, — гаворыцца ў віншаванні. — Сёння вы выконваеце высакародную місію — шчодра дзеліцеся мудрасцю і бясцэнным вопытам з таленавітай моладдзю, з'яўляючыся прыкладам для пераймання і адданасці выбранаму шляху». Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў Беларусі творчасць народнага артыста Расіі выклікае глыбокую павагу і любоў удзячнага гледача. Аляксандр Лукашэнка пажадаў Аляксандру Міту добрага здароўя, даўгалецця і дабрабыту.

**Конкурс.** Міністэрства інфармацыі аб'яўляе старт прыёму заявак на XIX Нацыянальны конкурс «Залатая Літара», які працягнецца да 27 красавіка ўключна. Конкурс праводзіцца штогод з мэтай садзейнічання развіццю друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, інфармацыйных агенцтваў і сеткавых выданняў Рэспублікі Беларусь, актуалізацыі значных тэматычных напрамкаў дзейнасці СМІ па рэалізацыі дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, павышэння прафесійнага і ідэйна-змястоўнага ўзроўню СМІ, стымулявання творчай дзейнасці журналістаў і іншых творчых работнікаў, занятых у працэсе вытворчасці СМІ. Пераможцы намінацый узнагароджваюцца дыпломамі і памятнымі знакамі — сімваламі «Залатая Літара». Арганізатар конкурсу — Міністэрства інфармацыі.

**Вернісаж.** Выстаўка «Дыялог з космасам» народнага мастака Беларусі Івана Міско адкрываецца сёння ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага. Яна прысвечана Дню касманаўтыкі і Дню яднання народаў Беларусі і Расіі. Касманаўтыка — адна з цэнтральных тэм творчасці скульптара. Выстаўка ўключае цэлую галерэю партрэтаў выдатных прадстаўнікоў «зорнай» прафесіі. Як паведамляюць арганізатары, сярод іх — ці не ўсе касманаўты былога Савецкага Саюза, а таксама касманаўты — ураджэнцы Беларусі Уладзімір Кавалёнак, Пётр Клімук і Алег Навіцкі. Народнаму мастаку пазіравалі і ўдзельнікі інтэрнацыянальных экіпажаў. Акрамя таго, на выстаўцы будуць прадстаўлены прадметы з калекцыі сям'і Юрыя Гагарына, здымкі з борта МКС, а таксама копіі графічных работ шэрагу мастакоў-фантастаў. Праект будзе працаваць да 30 красавіка.

**Спадчына.** Монаспектакль Івана Кірчука «Каравай» адбудзецца заўтра ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа, піша БелТА. Канцэртная праграма створана па матэрыялах шматлікіх фальклорна-этнаграфічных экспедыцый па Беларусі з 1983 да 2021 года. Будуць прадстаўлены песні, музыка, малітвы. Гэтая праграма неаднаразова дэманстравалася на розных пляцоўках Беларусі, брала ўдзел у фестывалях за мяжой. У цэнтры ўвагі — каравай, вясельны хлеб.

**Рэгіён.** У 2024 годзе статус «Культурная сталіца года» будзе прысвоены Бялынічам. Такое рашэнне прынята на пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры. Так, былі разгледжаны заяўкі і матэрыялы прэзентацый аб наданні статусу «Культурная сталіца года» такім гарадам, як Камянец, Глыбокае, Мазыр, Свіслач і Бялынічы. Як удакладняе БелТА, статус «Культурная сталіца года» прысвойваецца на падставе пэўных крытэрыяў. Сярод іх — дзейнасць у рамках культурнай асветы насельніцтва, наяўнасць матэрыяльна-тэхнічнай базы, увага да гісторыка-культурнай спадчыны. Члены калегіі атрымалі ацэначныя лісты, і падліковая камісія на падставе тайнага галасавання падвяла вынікі.

**Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ**

## у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

# Літкантакт: Брэст — Краснаярск

**Праз тысячы кіламетраў пралёг мост сяброўства паміж Брэстам і Краснаярскам. Не першы год супрацоўнічае з часопісам прозы, паэзіі і публіцыстыкі «Новый Енисейский литератор» брэсцкі фантаст Сяргей Белаяр. Ён і дапамог наладзіць кантакты пісьменнікам Расіі і Беларусі.**




12 сакавіка брэсцкая дэлегацыя выйшла на сувязь з краснаярскай. Да прагляду трансляцыі таксама далучыліся пісьменнікі з Лесасібірска, Мінусінска, Дзіўнагорска, Жалезнагорска і нават з Находкі.

На пачатку форуму ўдзельнікаў анлайн-канферэнцыі песнямі на беларускай і рускай мовах вітаў фолк-гурт «Лад».

Вершы пра братэрства народаў прачытаў заслужаны журналіст Георгій Тамашэвіч. Празаік, рэдактар Аляксандр Валковіч расказаў пра літаратурна-краязнаўчы альманах «Астрамечаўскі рукапіс». Паэтэса Таццяна Шульга прычытала свае творы. А кіраўнік літаратурнага клуба «ПоэтиКо» Наталля Кандрашук агучыла вершы на беларускай мове. Пра супрацоўніцтва з расійскімі пісьменнікамі, майстар-класы, творчыя паездкі, фестывалі павёў сваю гаворку старшыня грамадскай арганізацыі «Рускае таварыства» Сяргей Моладаў. Дырэктар гарадской цэнтралізаванай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна Святлана Гарадзецкая падзялілася цікавымі формамі працы з расійскімі пісьменнікамі, у тым ліку ў анлайн-фармаце.

Краснаярскае рэгіянальнае аддзяленне прадставіў старшыня Сяргей Кузічкін, а таксама яго намесніца, заслужаны работнік культуры Краснаярскага краю, паэтэса Марына Савіных, якая стаяла каля вытокаў стварэння літаратурнага часопіса для сямейнага чытання «Дзень і ноч». Метадыст Краснаярскага Дома мастацтваў Кацярына Маліноўская пазнаёміла з найстарэйшым у рэгіёне літаратурным выданнем — альманахам «Енісей». Паэтэса Таццяна Панова пранікнёна прачытала вершы пра сяброўства, любоў да Радзімы... Пра сваю дзейнасць як пісьменніка і выдаўца расказаў празаік, заслужаны работнік культуры Краснаярскага краю Уладзімір Несцярэнка. Выступілі таксама паэт і празаік, прафесар тэхналагічнага ўніверсітэта, доктар філасофскіх навук Міхаіл Яцэнка, празаік, публіцыст, журналіст, аўтар кнігі даследаванняў падзення Тунгускага метэарыта Мікалай Юрлаў, паэт і літаратурны крытык, прафесар аэракасмічнага ўніверсітэта, кандыдат філасофскіх навук Уладзімір Замышляеў.

Першая сустрэча натхніла на сумесныя творчыя задумы. У найбліжэйшым нумары альманаха «Берасцейская скарбніца» будуць надрукаваны творы краснаярскіх пісьменнікаў.

**Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ**

## з нагоды

# Пісьменнік — бібліятэка — чытач

**У Сусветны дзень паэзіі 10-я дзіцячая бібліятэка сустракала шаноўнага госця. На творчую сустрэчу з першакласнікамі СШ № 137 запрасілі вядомага беларускага паэта, перакладчыка, публіцыста, намесніка старшыні Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзіміра Мазго.**

Таленавіты аўтар ужо 50 гадоў піша цудоўныя вершы для дзяцей і дарослых, з-пад яго пяра выйшла 22 кнігі. Асобныя творы перакладзены на многія мовы свету. Асаблівы дар Уладзіміра Мазго — стварэнне мілагучных радкоў, якія становяцца папулярнымі песнямі і ўваходзяць у рэпертуар зорак беларускай эстрады.

Падчас сустрэчы дзеці паслухалі песню «Несцерка» і падарожнічалі па старонках розных кніг паэта. Аўтар пазнаёміў хлопчыкаў і дзяўчынак з вершамі, казкамі, загадкамі і каламбурамі са сваіх новых кніг «Вавёркі лушчаць зоркі» і «Хутка стану чэмпіёнам». Напрыканцы сустрэчы адбылася аўтограф-сесія.

**Таццяна ДЗМІТРЫЕВА,**
**вядучы бібліятэкар дзіцячай бібліятэкі № 10 г. Мінска**

## прэзентацыі

# Натхненне для душы

**Новы зборнік паэта Міхася Пазнякова «Меж землёй и небом» прэзентавалі ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа.**

Міхасю Паўлавічу заўсёды ёсць што расказаць чытачам. На творчай сустрэчы ў Доме-музеі Якуба Коласа пісьменнік распавядаў аб сваім дзяцінстве і бацьках, выказваў словы пяшчотнай любові да роднага краю, да Быхаўшчыны, дзе вырас, куды і цяпер з задавальненнем прыязджае.

Сваю бясконцую любоў да радзімы аўтар перадае ў творах. У зборнік «Меж землёй и небом» увайшлі вершы з кнігі «Спявае жыта», якія пераклаў на рускую мову паэт, педагог, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы Міхаіл Кулеш.

На імпрэзе гучалі вершы Міхася Пазнякова на рускай і беларускай мовах, іх чытаў сам аўтар, а таксама артысткі Тэатра паэзіі Тамара Кавальчук і Валянціна Драбышэўская. Песні на яго словы выконвалі вядомы артыст тэатра і кіно Сяргей Кравец, спявачка Іна Кравец, паэтэса і кампазітар Ала Ткачэнка.

**Вольга НАВАЖЫЛАВА**

# Добрае знаёмства

**У Мар'інагорскім агратэхнічным каледжы імя У. Е. Лабанка прайшла сустрэча з пісьменнікам, краязнаўцам Алесем Карлюкевічам. Размова ішла пра літаратурную і гістарычную памяць. Алесь Мікалаевіч — ураджэнец вёскі Зацітава Слабада Пухавіцкага раёна, і большасць яго гісторыка-публіцыстычных, краязнаўчых кніг прысвечана якраз роднай староньцы.**

Пісьменнік расказаў аб працы над такімі творамі, як «Літаратурная карта Пухаўшчыны», «І марам волю дам», «Пухавіччына: Літаратурнае гняздо Беларусі», «Ігуменскі павет», «За Цітаўкаю — Слабада».

Дарэчы, гісторыя аграрна-тэхнічнага каледжа цесна звязана з беларускім прыгожым пісьменствам. У розныя дзесяцігоддзі выкладчыкамі гэтай навучальнай установы працавалі драматург Васіль Гарбацэвіч, паэт-сатырык Захар Бірала, літаратуразнаўца Якуб Усікаў, мемуарыст, літаратуразнавец Хведар Імшэнік. Тут вучыліся паэты, празаікі Ганна Новік, Уладзімір Глушакоў, Андрэй Прохарчык. Пра гэта таксама расказваў госць будучым аграномам, механікам, электрыкам.

З асаблівай цікаўнасцю юнакі і дзяўчаты слухалі расповеды пра партызанскага паэта Усевалада Сабліна, які выдаў вершаваны зборнік «Мсціўцы» на акупаванай фашыстамі Рудзеншчыне, пра пісьменнікаў з баявой франтавой ці партызанскай біяграфіяй — Алеся Бачылу, Макара Паслядовіча, Пятра Рунца, якія выпеставаны ў пухавіцкіх паселішчах.

Варта заўважыць, пісьменнікі — частыя госці ў Мар'інагорскім агратэхнічным каледжы. Апошнім часам перад навучэнцамі і выкладчыкамі выступілі і пазнаёмілі іх са сваімі новымі кнігамі лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі, празаік, паэт, перакладчык Алесь Бадак, галоўны рэдактар часопіса «Полымя», паэт і перакладчык Віктар Шніп, іншыя сучасныя мастакі слова.

— Навучэнцы цікавяцца мастацкай літаратурай, — расказвае выкладчыца каледжа Алена Свірыдава, — ведаюць, якія ў краіне выдаюцца літаратурна-мастацкія перыядычныя выданні, наведваюць і наш раённы краязнаўчы музей, і Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа. Перакананa, што і чалавеку, які, здавалася б, непасрэдна не звязаны з гуманітарнай сферай, патрэбна добрае знаёмства з мастацкай кнігай.

**Сяргей ШЫЧКО**

конкурсы

# Герб, прыдуманы дзецьмі

**У СШ № 2 г. Лунінца ўзнагародзілі ўдзельнікаў конкурсу праектаў геральдычнага сімвала. Многія вучні таксама ў апісанні малюнкаў выказалі добрыя пачуцці да малой радзімы выпускніка школы пісьменніка Мікалая Калінковіча (1950—1990), якому было прысвечана творчае спаборніцтва. Усім канкурсантам — гэта 26 вучням — уручаны падзячныя лісты ад рэдакцыі раённай газеты «Лунінецкія навіны». Грамадскае журы падрыхтавала прызы.**

Стараста вёскі Цна Ніна Патурай выказала ўдзячнасць дзецям. Захвочаны 7-класнікі Яраслаў Гулевіч і Вікторыя Молчан, Дар'я Шаўцова (9 «Б»). Старшыня прафсаюзнага камітэта лакаматыўнага дэпо Аляксандр Матор падкрэсліў важнасць партнёрства, узнагародзіўшы суаўтараў — Матвея Зыкава і Мікіту Гаваяновіча (7 «Д»). Адзначаны і Дзмітрый Бусько (8 «А»). Ветэран педагагічнай працы Наталля Казанкава вітала маладзішага ўдзельніка спаборніцтваў — Яну Півавар (5 «Б»). Мастак-афарміцель раённага краязнаўчага музея Дзіна Грушэўская самым «геральдычным» назвала малюнак Дзмітрыя Мікуліча (7 «А»), які адлюстраваў раку Цна. Намеснік галоўнага рэдактара «ЛН» Аляксандр Коўка адзначыў, акрамя мастацкіх, і літаратурныя здольнасці Лізаветы Велясюк (11 «А»).

Творчасць вучняў здзіўляе і захапляе. Але ўзнагароджаны былі і педагогі, якія натхнялі сваіх выхаванцаў: Аксана Барысевіч, Ларыса Касенава, Святлана Кузьміч і многія іншыя.

Цырымонія ўзнагароджання адбылася ў філалагічным кабінеце з мемарыяльным кутком Мікалая Калінковіча. Гэта чарговая ініцыятыва Камісіі пры Саюзе пісьменнікаў Беларусі па творчай спадчыне земляка. Між тым геральдысты дадуць навуковую ацэнку здольнасцям юных лунінчан і дапамогуць у графічным адлюстраванні прапаноў. Галоўнае, што намаганні дарослых і дзяцей накіраваны на мір і стваральную працу, да чаго заклікаюць і год, і век.

**Таццяна КАНАПАЦКАЯ**

праекты

# З царкоўнай кнігай

**Выставачны праект «Праваслаўная кніга — шлях да дабра і міру» працуе ў епархіяльнай бібліятэцы пры Свята-Міхайлаўскім кафедральным саборы г. Ліды, якая дзейнічае пры філіяле «Лідская гарадская бібліятэка № 4». Арганізатары — Лідская епархія Беларускага экзархата Рускай праваслаўнай царквы і ДУК «Лідская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы».**



У фокусе — старадрукаваная царкоўная кніга і праваслаўная літаратура сучаснай рэдакцыі, прадстаўленыя на дзвюх выстаўках. Цікавым стала выступленне сакратара Лідскай епархіі протаіерэя Максіма Цыгеля, які расказаў прысутным пра значэнне Бібліі ў духоўным і свецкім жыцці чалавека, а таксама пазнаёміў са старадаўнімі рэлігійнацаркоўнымі выданнямі, якія адрозніваюцца ўнікальнай культурай кнігадрукавання.

Сучасныя кнігі, прадстаўленыя у другой экспазіцыі выстаўкі, значна адрозніваюцца ад экзэмпляраў першай. Гэта яркія, маляўнічыя выданні з фонду епархіяльнай бібліятэкі, які налічвае больш за дзве тысячы асобнікаў, акрамя электронных носьбітаў, часопісаў і календароў. На шматлікім кніжным матэрыяле адлюстраваны шлях Беларускай праваслаўнай царквы, гісторыя і лёс яе храмаў і святынь. Экспануюцца жыцці вялікіх беларускіх падзвіжнікаў і святых.

**Дар'я МАРЦІНКЕВІЧ, фота аўтара**

# Асяродак духоўнасці

**У пачатку года філіял «Альхоўская сельская бібліятэка» (Астравецкі раён) распачала рэалізацыю праекта «Бібліятэка — тэрыторыя духоўнасці».**

Сям'я з'яўляецца першым асяродкам, дзе дзіця атрымлівае базавыя веды пра дабро і зло, міласэрнасць, дапамогу, адзначыў падчас сустрэчы ў бібліятэцы іерэй Мікалай Уцякалка, які служыць у мясцовым праваслаўным храме.

Тэма патрыятычнага выхавання была ўзнята ветэранам працы Генадзем Бужымскім. Ён падкрэсліў, што дзеці і моладзь павінны паважаць сваю краіну, вучыцца абараняць яе, заставацца сапраўднымі патрыётамі.

Пасля размовы адбыўся прагляд старажытных Міней, якія падрыхтаваў святар. Самы ўнікальны экспанат — Мінея, датаваная 1724 годам. Не меншай увагі вартыя выданні XIX стагоддзя. Усе прадстаўленыя старадрукі захоўваюцца ў храме, а некаторыя і зараз выконваюць сваю функцыю падчас богаслужэнняў.

Увазе была прапанавана і кніжная выстаўка праваслаўнай кнігі «Жывая крыніца духоўнасці», падрыхтаваная сельскай бібліятэкай.

**Вольга ЗАЯНЧКОЎСКАЯ**

дарэчы

# Нагода павіншаваць

**Да 85-годдзя Кастрычніцкага раёна горада Мінска ў бібліятэцы № 19 прайшоў шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных юбілею. Госці і чытачы пазнаёміліся з відэарэпартажам пра раён.**

Пазітыўным настроем зарадзілі паэтэсы Ганна Максімовіч і Галіна Макарэвіч. Павіншавалі ўсіх сваім яркім выступленнем удзельніцы ансамбля індыйскага танца «Анджолі» пад кіраўніцтвам Валянціны Сланчэўскай. Шмат песень да святочнай даты былі выкананы Таццянай Гаруновай. Народнымі танцамі парадавала Ніна Садоўнікава — кіраўнік танцавальнага калектыву «Ведрусы».

Супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі выстаўку з раздзеламі «Іх імёнамі названы вуліцы», «Кастрычніцкі раён: традыцыі і будучыня». Любімы раён Мінска павіншаваў гэтак жа танцавальны гурт «Жалейка».

**Пётр САРАКУН**

імпрэзы

# Сур'ёзна і з усмешкай

**У сельскай бібліятэцы-клубе вёскі Брылі Магілёўскага раёна адбылася літаратурная імпрэза «Сур'ёзна і з усмешкай», прысвечаная 105-годдзю з дня нараджэння беларускага пісьменніка Эдуарда Валасевіча.**



Прысутныя пачулі аб жыцці і творчасці земляка-юбіляра, які нарадзіўся ў Магілёве, скончыў мясцовы педагагічны інстытут, а потым працаваў там выкладчыкам. Эдуард Станіслававіч прайшоў вогненнымі шляхамі Вялікай Айчыннай і заўсёды вызначаўся выключнай смеласцю і ў шэрагах магілёўскага знішчальнага батальёна, і на ваенных франтах. А потым ён смела змагаўся пісьменніцкім пяром з негатыўнымі праявамі жыцця, заняўшы сваё месца сярод таленавітых беларускіх байкапісцаў.

Да юбілею ў бібліятэцы падрыхтавалі біяграфічны буклет, а на афармленай кніжнай выстаўцы можна было пазнаёміцца з кнігамі, упрыгожанымі дарчымі надпісамі Эдуарда Валасевіча.

**Юлія ЯЦКОВА, фота аўтара**

памяць

# Былая вёска...

**Да 80-годдзя Хатынскай трагедыі ў бібліятэках Смаргонскага раёна прайшла акцыя «І памяць сэрца гаворыць…», былі аформлены кніжныя выстаўкі.**

У філіяле «Вішнеўская сельская бібліятэка» для школьнікаў прайшоў урок гісторыі «Звоняць трывожна ў Хатыні званы». У Гарадской бібліятэцы № 2 на мерапрыемства «Нам памяці звоняць званы» былі запрошаны навучэнцы сярэдняй школы № 6. У Сінькоўскай сельскай бібліятэцы прайшоў патрыятычны ўрок «Хатынь — сімвал вечнай памяці». У Гарадской бібліятэцы № 3 была арганізавана выстаўка-прагляд «Хатынь — былая вёска».

Да акцыі далучыліся работнікі бібліятэк у в. Лешчаняты, аг. Войстам, аг. Асінаўшчызна, аг. Бялкоўшчына.

**Юлія ЖУК**

«ЛіМ»-люстэрка

Брэсцкі тэатр лялек атрымаў запрашэнне на XVII Міжнародны тэатральны фестываль «Цар-Казка» ў Вялікім Ноўгарадзе, інфармуе БелТА. «Мы едзем у красавіку на фестываль у Вялікі Ноўгарад са спектаклем «Халстамер», — паведаміла намеснік дырэктара БТЛ Наталля Антанюк. — Яны самі выйшлі на нас і запрасілі прыняць удзел. Мы прапаноўвалі і іншыя спектаклі, але яны выбралі менавіта гэты». XVII Міжнародны тэатральны фестываль «Цар-казка» пройдзе ў Вялікім Ноўгарадзе з 21 да 25 красавіка. Гэта адзін са старэйшых расійскіх тэатральных фестываляў для маладога гледача. Форум праводзіцца з 1992 года кожныя два гады Наўгародскім тэатрам для дзяцей і моладзі «Малы». Спектакль «Халстамер» (Гісторыя каня) паводле аповесці Льва Талстога — адзін з самых тытулаваных у рэпертуары БТЛ. На XV Сусветным фестывалі тэатраў лялек у Празе спектакль быў адзначаны не толькі Гран-пры, але і трыма дыпломамі: за найлепшыя рэжысуру, сцэнаграфію і музычнае афармленне.

Пасольства Беларусі ў Карэі запусціла медыяпраект аб карэйцах у Беларусі, гаворыцца на сайце «СБ. Беларусь сегодня». Ініцыятыва прысвечана таму, які след пакінулі прадстаўнікі гэтай нацыянальнасці ў гісторыі нашай краіны. Так, лічыцца, што першым беларускім этнічным карэйцам стаў Інакенцій Пак, заслужаны ветэран Рэспублікі Беларусь. Ён быў удастоены вялікай колькасці дзяржаўных узнагарод, у тым ліку ордэна Айчыннай вайны I і II ступені і ордэна Чырвонай Зоркі. Яшчэ адзін герой медыяпраекта — вучоны Аляксей Кім. Ён доўгі час узначальваў Беларускі політэхнічны інстытут. Больш падрабязна пра лёсы выдатных карэйцаў у гісторыі Беларусі можна прачытаць у сацыяльных сетках беларускага дыппрадстаўніцтва ў Карэі.

Спектакль «Пачупкі» Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі стаў найлепшым спектаклем Міжнароднага маладзёжнага тэатральнага форуму «M@rt.кантакт-2023». «Залатую маску» пастаноўка атрымала па рашэнні прафесійнага журы, гаворыцца на сайце РТБД. Па версіі маладзёжнага журы найлепшым прызнаны спектакль «Марыя Сцюарт» Пецярбургскага камернага тэатра «ТОК». Прыз сімпатый гледачоў дастаўся пастаноўцы «Людзі Ламанчы» Арлоўскага дзяржаўнага тэатра для дзяцей і моладзі «Свабодная прастора». Фестываль праводзіцца з 2006 года і за гэты час стаў адной з самых яркіх і чаканых культурных падзей не толькі ў Магілёве, але і на ўсёй тэатральнай прасторы краіны. Асаблівасць форуму ў тым, што многія яго ўдзельнікі з'яўляюцца лаўрэатамі розных тэатральных прэмій. Геаграфія «M@rt.кантакту» шырокая: за ўсе гады правядзення на фестывалі паказаны 252 спектаклі — Магілёў наведалі тэатры з 21 краіны. Іх пастаноўкі ўбачылі больш за 50 тысяч гледачоў.

Нацыянальны этап адкрытага міжнароднага конкурсу выяўленчага мастацтва «Свята Свят» праходзіць у Беларусі, гаворыцца на афіцыйным партале Беларускай праваслаўнай царквы. Удзельнікі конкурсу — юныя мастакі з установ дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама індывідуальныя ўдзельнікі ва ўзросце ад 7 да 16 гадоў. Ім прапануецца выказаць у творчых работах свае пачуцці да Светлага свята Уваскрэсення Хрыстовага. У конкурсе таксама ўдзельнічаюць прадстаўнікі Расіі, Сербіі, Босніі і Герцагавіны, Малдовы. Па выніках нацыянальных адбораў арганізатары выберуць па 10 найлепшых работ ад кожнай краіны. Фінал міжнароднага конкурсу адбудзецца 28 красавіка ў мемарыяльным комплексе «Храм-помнік у гонар Усіх Святых і ў памяць аб ахвярах, якія выратаванню Айчыны нашай паслужылі» ў Мінску. Арганізатарамі правядзення нацыянальнага этапу выступілі Сінадальны аддзел БПЦ па супрацоўніцтве са свецкімі ўстановамі адукацыі, а таксама Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі Міністэрства адукацыі.

Выстаўка жывапісу члена Беларускага саюза мастакоў Уладзіміра Гладкова «Паміж небам і зямлёй», прысвечаная Дню яднання народаў Беларусі і Расіі, адкрылася ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага. У экспазіцыю ўвайшло больш за 50 твораў жывапісу, якія раскрываюць гістарычны ўклад жыцця, самабытнасць і нацыянальныя традыцыі народаў Беларусі, Расіі, Узбекістана, Туркменістана, Кыргызстана, Таджыкістана, Грэцыі, Турцыі, Кітая, Афганістана. Як тлумачыць БелТА, аўтар удзяляе ўвагу дэталям нацыянальнага касцюма, упрыгажэнням, традыцыйным заняткам і промыслам. У серыі гарадскіх пейзажаў паказана манументальная прыгажосць архітэктурных помнікаў Ніжняга Ноўгарада, Кастрамы, Самарканда, Бухары, Стамбула, Венецыі, Лейпцыга, Амстэрдама і іншых гарадоў. Дапаўняюць прыгажосць і ўнікальнасць тых краін, дзе пабываў мастак, прыродныя пейзажы. Выстаўка будзе працаваць да 30 красавіка.

**Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ**

# Найлепшыя ўзоры кнігадруку

Штогод, пачынаючы з 1960-га, у беларускай сталіцы праводзіцца Нацыянальны конкурс «Мастацтва кнігі». Ён мае на мэце ўзмацненне канкурэнтаздольнасці кніжнай прадукцыі айчынных выдавецтваў. Адной з галоўных задач, пастаўленых арганізатарамі, з'яўляецца павышэнне мастацкай і паліграфічнай культуры Беларусі. Па спісе пераможцаў можна меркаваць аб тэндэнцыях развіцця беларускай кнігі, што добра праілюстравалі вітрыны паабапал сцэны, дзе праводзілася цырымонія ўзнагароджання. За шклом размясціліся выданні — лаўрэаты конкурсу за апошнія тры дзесяцігоддзі. «Мастацтва кнігі», такім чынам, паўстае своеасаблівай справаздачай паліграфістаў, мастакоў, фотаілюстратараў, усіх спецыялістаў, якія маюць дачыненне да стварэння кнігі, аб праробленай за год працы.

Непасрэдна перад узнагароджаннем пераможцаў LXII Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі», якое адбылося 24 сакавіка ў рамках Міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, на сцэну падняліся член Расійскага кніжнага саюза, камерцыйны дырэктар выдавецтва «Русский Мир» Аляксандр Гароxаў і намеснік дырэктара Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь Ала Пенда. Пачэсныя госці з Расійскай Федэрацыі перадалі кніжніцы падарунак — 5-томную анталогію «Поэт в России — больше, чем поэт. Десять веков русской поэзии». Акрамя таго, Аляксандр Гароxаў заверыў, што па заканчэнні выстаўкі фонды Прэзідэнцкай бібліятэкі папоўняць каля 100 найменняў кніг выдавецтва «Русский Мир», а таксама альбомы Маскоўскага політэхнічнага ўніверсітэта.

«Хачу сказаць, што 2023 год знакавы для нашай установы. Сёлета мы адзначаем сваё 90-годдзе, а самы лепшы падарунак з такой нагоды — гэта, безумоўна, кніга, — выказала падзяку Ала Пенда. — Прэзідэнцкая бібліятэка крыху незвычайная, бо выконвае функцыі адразу некалькіх: прэзідэнцкай, урадавай, парламенцкай і публічнай. Нашы фонды даступны для кожнага грамадзяніна. Не сакрэт, што чытачом нумар адзін у нашай бібліятэцы з'яўляецца Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка, які надае вялікую ўвагу пытанням культуры, развіццю бібліятэк, развіццю выдавецкай і кнігагандлёвай дзейнасці. З задавальненнем прымаем ваш падарунак, і я ўпэўнена, што ён зойме пачэснае месца не толькі на паліцах нашай бібліятэкі, але і на выставачных вітрынах, каб яшчэ больш чытачоў змаглі скарыстацца гэтай літаратурай».

У 2023 годзе за права атрымаць «Залаты фаліянт» — традыцыйную ўзнагароду конкурсу «Мастацтва кнігі» —

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.



*Намеснік міністра інфармацыі Ігар Бузоўскі ўручае ўзнагароду дырэктару выдавецтва «Беларусь» Сяргею Пешыну.*

змагаліся больш за 30 дзяржаўных і прыватных выдавецтваў. На суд журы, у склад якога ўвайшлі вядомыя прадстаўнікі сферы культуры і дзяржаўнага кіраўніцтва, было прадстаўлена 144 выданні. Перад калектывам экспертаў на чале з рэктарам Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, ганаровым членам Расійскай акадэміі мастацтваў, кандыдатам мастацтвазнаўства Міхаілам Баразной стаяла няпростая задача — выбраць з гэтага мноства тыя выданні, якія вызначаліся б выключнай якасцю мастацкага, дызайнерскага і паліграфічнага выканання.

Пераважная большасць статуэтак «Залаты фаліянт» — на рахунку дзяржаўных выдавецтваў, сярод якіх лідзіруюць «Беларусь» і Выдавецкі дом «Звязда». У першай намінацыі «Беларусь помніць» (выданні па гісторыі, якія выхоўваюць любоў да Радзімы і патрыятызм) дыплом пераможцы і ганаровы знак-сімвал «Залаты фаліянт» атрымала выдавецтва «Беларусь» за кнігі «Герои Беларуси» і «За други своя. Герои и подвиги Беларуси». У сваю чаргу ў намінацыі «ЛІТ-фармат» звання пераможца быў удастоены Выдавецкі дом «Звязда» за выпуск выдання ў дзвюх кнігах «Трудные пути жизни» Мікалая Чаргінца.

Галоўнымі ўзнагародамі ў намінацыях «Залатыя скрыжалі» і «Падручнік новага веку» адзначаны адпаведна выдавецтвы «Беларусь» (даведачнае выданне «Ордена, медали и нагрудные знаки Республики Беларусь») і «Адукацыя і выхаванне» (кніга «Беларусь — наша Радзіма. Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі першакласніку»). Перамога ў намінацыі «Навука і веды» (навуковыя, навукова-папулярныя выданні) — за Выдавецкім домам «Беларуская навука» (манаграфія «Язэп Драздовіч. Моўная і этнаграфічная спадчына: архіўныя матэрыялы»). У намінацыі «За ўклад у захаванне гісторыка-культурнай спадчыны» першы дыплом не ўручаўся.

Дыплома пераможцы ў намінацыі «Праўда памяці» ўдастоена выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» за кнігу «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці». Перамога ў намінацыі «У люстэрку часу», у якой прадстаўлены выданні, што адлюстроўваюць на сваіх старонках сацыяльна-эканамічнае развіццё нашай краіны, — на рахунку выдавецтва «Беларусь» (за выданне кніг «Прокуратура Беларуси. 100 лет»). У сваю чаргу кніга «Беларусь — Россия: партизанское движение в годы Великой Отечественной войны» Выдавецкага дома «Звязда» была прызнана найлепшай у намінацыі «Садружнасць». Поспех чакаў выдавецтва і ў наступнай намінацыі — «Разам з кнігай мы расцём». У ёй журы прысудзіла перамогу кнізе Алены Стэльмах «Пашка і сонечны праменьчык».

Лідарам намінацыі «Фотапогляд» стала кніга-альбом «Улицы любимого города. Гомелю 880 лет» Выдавецкага дома «Гомельская праўда». Дыплома 1-й ступені ў намінацыі «АРТ-кніга», дзе разглядаліся выданні па выяўленчым мастацтве, удастоена выдавецтва «Беларусь» за кнігу «Нацыянальная бібліятэка. 100 гадоў». Акрамя таго, членамі журы ў персанальнай намінацыі «Майстэрства» былі вызначаны найлепшыя ілюстратар і фотамастак. Імі сталі адпаведна Лілія Бусарава (за афармленне кнігі Эдзі Агняцвет «Мой рыжы Бім») і Анатоль Дрыбас (за шматгадовую працу ў галіне беларускага кнігадруку і аўтарскую фотаздымку да кніг «Беларуская кухня» і «Нацыянальная бібліятэка. 100 гадоў»). Найвышэйшая ўзнагарода — Гран-пры ў намінацыі «Трыумф», ганаровы знак-сімвал «Залаты фаліянт» і ганаровы дыплом імя Францыска Скарыны — прысуджана за кнігі «Геноцид белорусского народа» і «Геноцид белорусского народа. Лагеря смерти», якія пабачылі свет у выдавецтве «Беларусь».

«Хацелася б, каб і чытач, і дзяржава радаваліся за нашу кнігу, за яе змест, напаўненне, бо ў ёй — веды, думкі, якія дазваляюць канструктыўна будаваць нашу будучыню, — сказаў падчас цырымоніі ўзнагароджання сустаршыня журы конкурсу, намеснік міністра інфармацыі Ігар Бузоўскі. — Аднак афармленне — таксама немалаважная справа, і я спадзяюся, сёлетнія пераможцы дастойна папоўняць калекцыю найлепшых узораў нацыянальнага кнігадрукавання».

**Бернард ЗАТЫЛКІН**
**Фота Лізаветы ГОЛАД**

# Інтрыга, цікавасць, захапленне

**Колькі было чыстасардэчнай шчырасці, жыццялюбнага юнацкага запалу, іскрамётнага шчасця і захаплення ў вачах маладых людзей — школьнікаў і студэнтаў. А таксама ў іх работах, што экспертнае журы адзначыла ў ліку найлепшых! У межах XXX Мінскай міжнароднай кніжкай выстаўкі-кірмашу адбылося ўзнагароджанне пераможцаў Рэспубліканскага конкурсу *«BOOKTRAILER»*.**

Конкурс праходзіў ужо трэці раз, і падобна на тое, што папулярнасць яго з году ў год расце: колькасць заявак у шмат разоў перавысіла чаканую лічбу — сёлета іх было больш чым 650. Удзельнікам прапанавалася зняць невялікі ролік у адвольнай форме пра ўпадабаны мастацкі твор. Прычым сюжэтная частка работы, адлюстроўваючы змест твора, у спалучэнні са «словамі аўтара» альбо стваральніка відэароліка, настолькі павінна была зацікавіць гледача, зацягнуць, заінтрыгаваць, каб ён адшукаў кнігу і прачытаў ад пачатку да канца.

Намінацый, у якіх прадстаўляліся ролікі, было тры. Яны ахапілі ўсю гісторыю развіцця айчыннай літаратуры: ад летапісаў і хронік да твораў нашых дзён.

Так ці інакш, але галоўнымі арганізатарамі, сцэнарыстамі, акцёрамі і аператарамі выступілі маладыя людзі ад 14 да 31 года.

На што найперш звяртала ўвагу журы ў складзе прадстаўнікоў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскага маладзёжнага цэнтра і Саюза пісьменнікаў Беларусі? Як можна заўважыць па работах, што атрымалі перамогу, — на нестандартнасць, крэатыўнасць, шчырую размову «на роўных» са сваімі аднагодкамі.

Так, у намінацыі «Старажытная беларуская літаратура (XI—XVII стагоддзі)» найлепшым прызналі ролік па творы Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра». Яго стварыў калектыў навучэнцаў смаргонскай школы № 5 — Цімафей Забрамскі, Ангеліна Патанейка і Валерыя Садоўская. Варта адзначыць смеласць аўтараў гэтай яскравай карціны па знакамітым творы, у якім няма сюжэта ў звыклым яго разуменні — адлюстраваная гістарычная панарама эпохі Адраджэння стварае шмат вобразаў выбітных асоб і слынных падзей.

Здавалася б, зусім іншы па жанры і танальнасці твор, які прызнаны найлепшым у наступнай намінацыі — «Новая беларуская літаратура (першая палова XVIII—XIX стагоддзе)». Але і яго стваральнікі — вучні той самай смаргонскай школы: Маргарыта Дудко, Караліна Кавяка, Антон Шалік, Віялета Чартовіч і Даніїл Карасевіч — выявілі неардынарны падыход да напісання сцэнарыя: тое, што гледачы пабачылі на экране, нагадвала ўрывак з мастацкага фільма ў жанры фэнтэзі. Карціна «абрываецца» на самым напружаным моманце, і каб даведацца, як далей разгортваўся сюжэт, неабходна зазірнуць у зборнік фантастычных апавяданняў…

Да класікі звярнуўся і пераможца, адзначаны ў намінацыі «Найноўшая беларуская літаратура (ад пачатку XX стагоддзя да сучаснасці)» — Ільюо Братачкіна з сярэдняй школы № 2 горада Слаўгарада натхніла паэма «Новая зямля» Якуба Коласа. Вобраз хлопчыка — музыкі, узгадаванага нядоляй любай зямлі і ў той жа час яе прыгажосцю, напеўнасцю і меладычнасцю роднай мовы, матчынай песні, якія цудоўнымі



*Пераможцы конкурсу «BOOKTRAILER».*

гукамі скрыпкі абуджае ў чалавеку найлепшае, пэўна, з'яўляецца архетыпным для нашай літаратуры — менавіта гэта было адлюстравана ў сюжэце роліка.

Акрамя названых намінацый, удзельнікі змагаліся за прыз сімпатый гледачоў і Гран-пры конкурсу. Так, найлепшай работай, на думку гледачоў, стаў буктрэйлер па аповесці Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха», створаны Мікітам Гарбачовым з Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Дзёрзкасць, высакароднасць, непахіснасць у адстойванні справядлівасці, рамантычнасць натуры — найлепшыя якасці, уласцівыя героям Караткевіча, былі прадэманстраваны і ў рабоце, сюжэт якой разгортваецца ў нашы дні.

Галоўны прыз экспертнае журы аддало Марыі Бондаравай з сярэдняй школы № 16 горада Мазыра. Яна зняла захапляльны ролік з элементамі містыкі па кнізе Яўгена Хвалея «Прынцэса тусоўкі». Нездарма аповесць пра сучасных падлеткаў з дэтэктыўным сюжэтам нязменна карыстаецца папулярнасцю ў школьнікаў: напісана яна так, што ад першай да апошняй старонкі трымае ў напружанні, а цікавасць і інтрыга толькі ўзрастаюць.

Узнагароджвалі юных пераможцаў начальнік упраўлення па справах моладзі — намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Таццяна Сіманоўская і дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч. Работы лаўрэатаў будуць захоўвацца ў бібліятэчнай сістэме краіны з мэтай прарэкламаваць кнігу чытачам-падлеткам.

**Таша ШПАКОЎСКАЯ, фота аўтара**

# Дзе дабро перамагае зло…

**Мары — рана ці позна — збываюцца, у жыцці заўжды ёсць месца цуду, калі ў яго верыць. Бязмежная, невычэрпная любоў да жыцця і людзей; інклюзія і ацаленне; назіранне за светам раслін і жывёл — гэтыя і многія іншыя тэмы знайшлі сваё адлюстраванне ў вершах і прозе, прадстаўленых да ўдзелу ў літаратурным конкурсе-стартапе *LitUP*, што сёлета адбыўся трэці раз. Больш ад 200 праектаў мастацкіх выданняў, разлічаных на дзяцей, падлеткаў і дарослых, змагаліся за права быць рэалізаванымі ў найстарэйшых айчынных выдавецтвах — «Народнай асвеце», «Мастацкай літаратуры», Выдавецкім доме «Звязда» і выдавецтве «Беларусь». Вынікі конкурсу былі агучаны на XXX Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы: прадстаўленне іх і прайшло на манер сапраўднага кірмашу — спачатку кожны з удзельнікаў распавядаў пра сваю задуму і дэманстраваў відэапрэзэнтацыю будучай кнігі, а пасля на сцэну выходзілі прадстаўнікі выдавецтваў і «разбіралі» найбольш упадабаныя праекты.**

Асноўнай мэтай конкурсу з'яўляецца пошук і падтрымка таленавітых айчынных аўтараў і ажыццяўленне найбольш перспектыўных праектаў. Асаблівасць спаборніцтва ў тым, што да ўдзелу запрашаюцца ўсе ахвотныя, без абмежавання ўзросту — як пачаткоўцы, на творчым рахунку якіх няма пакуль ніводнага выдання, так і масцітыя літаратары, члены пісьменніцкай арганізацыі. Ёсць у такой форме супрацоўніцтва з аўтарамі свая «разыначка» і для выдавецтваў, якія ў дадзеным выпадку пачынаюць працу па выданні той ці іншай кнігі на загадзя падрыхтаваным матэрыяле, што адпавядае шэрагу заяўленых умоў.

Цікава было папрысутнічаць на падвядзенні вынікаў не толькі ў якасці прыхільніка пэўнай тэматыкі ці ўпадабанага аўтара, але і як аматару прыгожага пісьменства: прадэманстраваныя работы паказалі своеасаблівы зрэз творчых ідэй, што лунаюць у прасторы сучаснасці, і ўражанне ад таго, чым жывуць цяпер суайчыннікі з розных куткоў Беларусі, што іх найбольш хвалюе і натхняе, пра што яны думаюць і якой бачаць сваю радзіму і тых, хто побач.

Адкрыў урачыстасць намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар Бузоўскі, звярнуўшыся да фіналістаў з прывітальным словам:

— Спадзяюся, што вы станеце пераможцамі не толькі ў сённяшнім нашым мерапрыемстве, але і ў працэсе, які мы сумесна арганізавалі ў межах гэтага спаборніцтва: вашы творы пабачаць свет у вядучых выдавецтвах краіны. Пажадаю вам удачы — не проста творчай, але і арганізацыйнай. Зроблены крок — гэта толькі частка шляху, хай і складаная, якую патрэбна было прайсці. Але працаваць з выдавецтвам на ўсіх этапах — важная, напружаная работа, і хацелася б, каб у выніку яна была паспяховай.

Адной з фіналістак конкурсу стала Улада Альхоўская, маладая пісьменніца, аўтар п'ес, якія былі пастаўлены ў тэатрах Беларусі. Гэтым разам дзяўчына выступіла крыху ў нязвыклым амплуа: прапанаваны ёй зборнік змяшчае пад вокладкай містычныя гісторыі аб жыцці Мінска — тых яго баках, што часта застаюцца па-за полем зроку звычайнага жыхара альбо госця сталіцы, але, тым не менш, уплываюць на ход падзей горада. Улада распавяла, што натхніла яе на такі незвычайны напрамак творчасці:




*Намеснік дырэктара — галоўны рэдактар «Мастацкай літаратуры» Віктар Шніп уручае дыплом пераможцы Таццяне Дашкевіч.*

— Галоўным «рухавіком» для стварэння сюжэта паслужыла любоў да Мінска. Мне падаецца, наш горад недаацэнены: тут надзвычай шмат прыгожых архітэктурных форм, старых паркаў, векавых дрэў — усё гэта натхняе на пэўны містыцызм і стварэнне адпаведнага летапісу горада: на фоне такіх дэкарацый проста не магла не нарадзіцца цікавая гісторыя пра Мінск, пра людзей, якія тут жывуць, і пра тое, як гістарычна-міфалагічная спадчына горада можа стасавацца з сучасным падыходам, — разважала пісьменніца. — Вельмі шмат ёсць месцаў, пра якія хацелася б расказаць. Напрыклад, я ў захапленні ад старога парку на Камсамольскім возеры: даўнія алеі, астравы на Свіслачы (нават у маім рамане адлюстраваўся «Птушыны востраў», які я вельмі люблю) — спалучэнне старадаўняй прыроды і блізкай мяжы горада з яго шматпавярховікамі — сапраўднае месца сілы! Люблю там гуляць, няспешна хадзіць, прыдумляць, назіраць, як скрозь кроны таполяў прасочваецца сонца!.. Гэта будзе першае выданне ў Беларусі, але спадзяюся і на працяг, — распавядала Улада. — Выдавалася я не раз у Расіі, супрацоўнічаю з выдавецтвамі гэтай краіны ўжо 13 гадоў, але заўсёды марыла, каб мае творы пабачылі свет і на Радзіме — а тут якраз конкурс! Падавалася як пачатковец, і для мяне проста бясцэнна, што выдавецтва «Беларусь» абрала для выдання маю кнігу. Веру, што ўсё атрымаецца! У творчасці я спалучаю драматургію і прозу — гэта дапамагае жыць, гэта любоў назаўжды. Не заўсёды ўсё проста, але пакуль ува мне гарыць жаданне распавядаць гісторыі, не сыду з гэтай дарогі!

Як найцікавейшы расповед пра будучую кнігу пад назвай «Апавяданні са стала» прагучала гісторыя Таццяны Дашкевіч. Па яе словах, у маладосці яна ніколі не ўсведамляла сябе як празаіка. Ствараліся апавяданні нячаста, ад выпадку да выпадку, без мэты адразу ж іх апублікаваць, складваліся ў стол. А цяпер аўтарка параўнала яго з чароўным чамаданчыкам… Натхняў муж, пісьменнік Мікалай Шыпілаў. Тэматыка апавяданняў — з жыцця: героі іх сустракаюцца сярод звычайных людзей з іх праблемамі і канфліктамі. Некаторыя расповеды — аўтабіяграфічныя, напісаныя з гумарам. Не чужыя для іх і філасофскія разважанні. Галоўная ідэя таго, што Т. Дашкевіч хоча данесці да чытача — ідэя аб прыгажосці чалавечай душы і яе ўзвышэнні, катарсіс і любоў да жыцця.

— Літаратура для таго і ствараецца, каб рабіць чалавека лепшым, — пераканана Т. Дашкевіч. Кніга яе апавяданняў пабачыць свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура».

У шэрагу пераможцаў аказалася і Ганна Альхоўская, аўтар кнігі «Халодны разлік»:

— У мяне выйшла больш чым 20 кніг — і ўсе ў Расіі, нягледзячы на тое, што я — у ліку членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі. А вось цяпер буду выдавацца і на Радзіме! — падзялілася радасцю пісьменніца. — Гэтая мара і падштурхнула мяне да ўдзелу ў конкурсе! Кніга, якая перамагла ў спаборніцтве, — лёгкі дэтэктыў з элементамі меладрамы і гумару. Вырашыла напісаць пра тое, пра што было б цікава чытаць мне самой (а значыць, і іншым), каб кніга дазволіла хоць на час забыць пра ўласныя праблемы. Пішу, не перагружаючы чытача цяжкімі падрабязнасцямі, як часам бывае ў «мужчынскіх» дэтэктывах. Аднойчы мяне назвалі аўтарам бульварнага чытва. Але што ў тым кепскага? Сур'ёзная літаратура, вядома, патрэбна, але часам хочацца пераключыцца, бо інакш можна проста звар'яцець! Пачала пісаць кнігі ў надзвычай цяжкай жыццёвай сітуацыі, калі хацелася стварыць уласны свет і сысці туды, дзе дабро перамагае зло і ў выніку ўсё становіцца добра. Цяпер да ўсіх складанасцей стаўлюся з гумарам: калі смяешся з нейкай праблемы, яна бянтэжыцца, мізарнее і з ёю лягчэй справіцца!

Праект Ганны Альхоўскай плануе рэалізаваць Выдавецкі дом «Звязда».

**Таша ШПАКОЎСКАЯ**
**Фота Лізаветы ГОЛАД**

# Кветкі з-пад снегу

**25 сакавіка ў межах XXX Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу адбылося ўзнагароджанне пераможцаў VI Міжнароднага конкурсу маладых літаратараў і прэзентацыя новага нумара альманаха «Першацвет».**

Упершыню конкурс быў аб'яўлены ў 2016 годзе Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь, РВУ Выдавецкі дом «Звязда» і выдавецтвам «Мастацкая літаратура». За апошнія гады пераможцамі стала больш за 120 творцаў, якія не збочылі з творчага шляху: нехта ўступіў у Саюз пісьменнікаў Беларусі, нехта выдаў уласную кнігу, нехта стаў намінантам іншых літаратурных прэмій.




У рэдакцыйны савет альманаха ўвайшлі Алесь Карлюкевіч (старшыня), Алесь Бадак, Вольга Рацэвіч, Аляксей Чарота, Віктар Шніп.

Творы найлепшых па меркаванні журы 10 паэтаў і 10 празаікаў па традыцыі былі апублікаваны на старонках «Першацвета». Сярод паэтаў пераможцамі сталі Алесь Бараноўскі, Паліна Басалыга, Яніна Босак, Алесь Гоман, Паліна Дваранская, Андрэй Кімбар, Ірына Макарчук, Вольга Міхаленка, Яўгенія Пракапчук, Вольга Шпакоўская.

Прозу прадставілі Дзмітрый Аўчыннікаў, Сафія Ворса, Ягор Жукоўскі, Аляксандра Кароль, Паліна Корнева, Юлія Макарэвіч, Іван Мелаў, Матвей Шышко, Маргарыта Ядзевіч, Яна Цэгла.

Удзельнікі ўрачыстасці атрымалі дыпломы, падпісаныя старшынёй Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесем Карлюкевічам. Галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» Вольга Рацэвіч павіншавала маладое пакаленне з заслужанай перамогай, адзначыўшы, што для кожнага з іх гэтая публікацыя стане новай прыступкай на шляху ў вялікую літаратуру.

Так, самай маладой аўтарцы Маргарыце Ядзевіч усяго 14 гадоў, яна вучыцца ў 8 класе мінскай школы. А самаму старэйшаму — Алесю Бараноўскаму — 34, паэт з'яўляецца навуковым супрацоўнікам Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Большасць аўтараў аддаюць перавагу беларускай мове, але прадстаўлена і рускамоўная літаратура: вершы Яніны Босак, Вольгі Міхаленкі і Ірыны Макарчук, а таксама празаічныя творы Матвея Шышко і Маргарыты Ядзевіч.

Асобныя аўтары ўжо маюць апублікаваныя кнігі і нават узнагароды. Сярод іх Сафія Ворса,



*Фота Таццяны Дашкевіч.*

*Маргарыта Ядзевіч.*

уладальніца медаля А. П. Чэхава Расійскага саюза пісьменнікаў, аўтар кніг «Дзесяць простых гісторый», «Горад сляпых скрыжаванняў», «Рыба», «Дзень настаўніка». Юлія Макарэвіч — лаўрэат конкурсу маладых літаратараў Саюзнай дзяржавы «Мост дружбы». Паліна Дваранская — лаўрэат Рэспубліканскага конкурсу студэнтаў і школьнікаў «БрамаМар», фіналістка IV Міжнароднага маладзёжнага фестывалю-конкурсу паэзіі і паэтычных перакладаў «Берагі дружбы», а яе пераклады ўвайшлі ў зборнік «Усе мы шукаем музыку шчасця».

Падчас прэзентацыі Віктар Шніп, намеснік дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура», адзначыў, што ўвесь наклад альманаха «Першацвет» быў выкуплены публічнымі бібліятэкамі і аматарамі беларускай літаратуры на кніжным кірмашы.

**Валянцін САЛОМА**

# Пошукі правільнага светапогляду

**У Выдавецкім доме «Звязда» падрыхтавана да друку кніга Ігара Хадановіча «Чалавек з маёй біяграфіі». Шмат намаганняў дзеля нараджэння гэтай кнігі прыклаў, прыкладвае ветэран педагагічнай працы Вацлаў Матусевіч. Доўгія гады ён працаваў начальнікам аддзела адукацыі Дзяржынскага райвыканкама. Менавіта Вацлаў Іванавіч стаў ініцыятарам нараджэння новага выдання твораў Ігара Хадановіча…**

Так склалася, што кнігі выйшлі, выходзяць (усё!) пасля смерці пісьменніка і журналіста. Так склалася… Так, як не павінна было б складвацца. Ігар Хадановіч — яшчэ адзін няспраўджаны лёс у беларускім прыгожым пісьменстве, якое ва ўсе гады патрабуе шчырых, самаахвярных, сумленных і гарачых руплўцаў. А іх заўсёды не стае… Сапраўдных — не стае.

Перакладваю, перагортваю кнігі трох аўтараў, якія рана, зусім рана былі пазбаўлены жыцця. Яны ў мяне побач: то на паліцы перад рабочым сталом, то на самім стале ў адзін стосік выкладзены… Яны разам па асабістых чытацкіх зацікаўленнях розных гадоў — кніга магіляўчаніна Міхаіла Малочкі «Жыў-быў хлапец…» (аўтар зусім юным, студэнтам Маскоўскага інстытута філасофіі, літаратуры і мастацтва, загінуў на савецка-інляндскай вайне), зборнік нарысаў, артыкулаў, творчых партрэтаў Міколы Дзяшкевіча «Ад вытокаў радаводных» (24-гадовы малады чалавек трагічна загінуў у 1971 годзе на Нёмане, калі ўратоўваў жанчыну з дзіцем), зборнік апавяданняў Ігара Хадановіча «За акном дождж» (трагічна загінуў ад рукі бандыта ў горадзе)…

Ігару Хадановічу было ўсяго толькі 25 гадоў…

Росквіт чалавечага жыцця здараецца ў маладыя гады. Самыя таленавітыя, яркія асобы праяўляюць сябе вялікімі творцамі зусім юнымі. Колькі іх, яркіх асоб, якія маглі б прайсці шырокімі дарогамі жыцця, зрабіць нашмат болей, чым ім дазволіў лёс, чым дазволілі ўсявышнія сілы!.. Мусіць, яны былі б самыя лепшыя сярод астатніх… Размова — і пра малавядомых сёння Мішу Малочку, Міколу Дзяшкевіча, Ігара Хадановіча.

Ужо ў другой кнізе «На досвітку» — перавыданні ранейшага зборніка «За акном дождж» з нарысамі, старонкамі запісных кніжак, пісьмамі да сяброў у якасці дадатку — чытаем у лісце Ігара Хадановіча да паэта, празаіка, сябра па ўніверсітэце Уладзіміра Паўлава: «…Ты пішаш “займайся б ты літаратурнай працай”, а для мяне тут няма выбару, хоць, можа, я, па Чэхаву, ужо спісаўся, так нічога і не напісаўшы. Усе мае блуканні… — пошукі правільнага светапогляду, як асновы будучай літаратурнай працы. Такі ўжо мой дурны характар, што мне трэба спачатку даведацца, што больш стымулюе прагрэс грамадства — дух саперніцтва ці дух супрацоўніцтва, — тады я сяду за стол і буду разбірацца ў псіхалогіі сваіх герояў…»

І ў зборніка «За акном дождж», які выйшаў у 1967 годзе (выдадзены па свежых слядах — памёр пасля бойкі малады пісьменнік 9 студзеня 1966 года), і ў кнігі «На досвітку», якая выйшла ў 1986 годзе, — аднолькавыя тыражы: 6000 экзэмпляраў. І ў гэтым праявілася не проста тагачасная сітуацыя з цікаўнасцю да папяровай кнігі ўвогуле. Ігар Хадановіч і тады быў, і цяпер застаецца мастацкай, грамадзянскай з'явай. Вы толькі ўчытайцеся ў яго апавяданні і нават нарысы. Пра сваю настаўніцу напісаў восьгэты тэкст (нарыс «Чалавек з маёй біяграфіі»): «Беглы кароткі сон дзяцінства: зачараваныя дзяўчынкі, прыцiхлыя хлапчукі — мой клас, і яна, казачна недасяжная, але такая блізкая і зразумелая — мая настаўніца, Яўгенія Васільеўна, выкладчыца літаратуры. Выкладчыца?.. Якое чэрствае, непрывабнае слова. Тое, што прыходзіла ў клас разам з ёю — прыгожай, абаяльнай, тады маладзейшай на адзінаццаць гадоў, з адухоўленым тварам і трошкі велікаватымі жвавымі вачыма, — нячутна ўваходзілі бадзёра-іранічны, а часам сентыментальны Пушкін, ледзь-ледзь маркотны і самотны Лермантаў…

Паэзія не стукалася ў дзіцячыя сэрцы, яна ішла туды плынню, прымушала заміраць і трапятаць, і мы адчувалі, што на нейкай не вядомай нам хвалі нашы сэрцы пачыналі біцца суладна з сэрцам яе і сэрцамі тых, каго яна ўводзіла ў клас».

Варлен Бечык так выказаўся пра прозу Ігара Хадановіча: «Чытаем апавяданні Ігара Хадановіча — і адчуваем яго захапленне духоўна прыгожымі людзьмі, усхваляванасць “матэрыялам”, асаблівую ўвагу да ўнутранага жыцця, «псіхалогіі» чалавека, непрыняцце жыццёвых і творчых шаблонаў. Бачым: аўтар вядзе пошук на розных кірунках, паядноўвае лірызм і аб'ектывізаваны паказ, з поспехам выкарыстоўвае гумар, псіхалагічна насычае пейзажны малюнак, адкрывае стоены сэнс штодзённага побыту, паэтычна паказвае працу і каханне, не цураецца сатырычных сродкаў». І далей: «Героі апавяданняў Хадановіча ледзь не заўсёды паказваюцца ў пераадоленні нейкіх маральных ускладненняў, калі ім даводзіцца адстойваць сваю жыццёвую пазіцыю. Іхні роздум, унутраны клопат і з'яўляецца, уласна кажучы, сюжэтным стрыжнем твора, да якога пачуццём героя (ці аўтара) прыцягваюцца ў меру неабходнасці знешнія падзеі. Так напісаны,


Ігар Хадановіч.

у прыватнасці, апавяданні “На досвітку”, “За акном дождж”, “Полем ідзе чалавек…”»

«Высакароднае аблічча» — вось што служыла магнетычным прыцягненнем у выбары герояў, тых жыццёвых вобразаў, якія малады літаратар імкнуўся ўзвесці на вышыні мастацкага асэнсавання рэчаіснасці. У яго быў выключны пісьменніцкі і чытацкі слых. Якімі сімпатычнымі падаюцца думкі аб прачытаным, выкладзеныя Ігарам Хадановічам у лістах да жонкі М. Марозавай, 9 студзеня 1965 г.: «… Ну, кніг у мяне зараз па горла і нават трохі вышэй. Сёння 7-е, значыць, па 15-17 ніякай літаратуры насіць не трэба. Толькі газеты. <…>

Усё, што я чытаю цяпер (Паўстоўскі — Сіманаў), павінна было быць прачытана мною раней. Але я, нягоднік, не зрабіў гэтага…

<…>

У каго ж ты дастала Пяскова?

Што там у вас у рэдакцыі? Як Паўлаў? У яго ў “Маладосці” ідзе ў гэтым годзе аповесць. Дарэчы, ці прачытала ты ў “Полымі” нарыс М. Стральцова — да чаго разумны гэты Стральцоў.

…Яшчэ: дзіўлюся тваёй усюдыіснасці, ці што — як толькі ты змагла выявіць у часопісах Далматоўскага і Залыгіна, няўжо перабірала ўсё? Дарэчы, якія моцныя вершы Далматоўскага, прачытаеш. Мяне цікавіць, ці думаеш ты чытаць Сіманава “Салдатамі нараджаюцца”. Скажу адно — лепшага рамана за апошнія гады няма. А пра вайну наогул лепшага рамана няма…»

Далёкі ад нас па часе Ігар Хадановіч пісаў у сваім часе і пра свой час, пра чалавека тых, 1960-х, пасляваенных гадоў. Здавалася б, творы пачынаючага літаратара маглі б і застацца ў 1960—1970-х… Прайшло болей чым паўвека… Здарылася іначай: радкі, выпеставаныя светлым натхненнем «адліжных» гадоў, засталіся, застаюцца з намі. Значыць, ёсць у гэтых творах адвечная мастацкая сіла, якая патрэбна розным пакаленням чытачоў?!.

Не, лёс Ігара Хадановіча і лёсы згаданых мною Мішы Малочкі, Міколы Дзяшкевіча і шмат яшчэ каго з тых, хто пакінуў белы свет занадта рана, усё ж спраўджаныя. Як памяць — кнігі, напісаныя, здзейсненыя імі. Яны і цяпер вабяць з кніжных паліц, прыцягваюць чытацкую ўвагу.

Можа, прыйдзе час — і на Дзяржыншчыне, дзе пісьменнік нарадзіўся, з'явіцца школа яго імя. Альбо — вуліца Ігара Хадановіча ў самім Дзяржынску. Так павінна быць!..

**Мікола БЕРЛЕЖ**

# На шляху развіцця

**Ёсць кнігі, неабходнасць у якіх у грамадстве наспявае, — справа ў надзённасці, важнасці і актуальнасці. Ёсць творы, да выдання якіх падштурхоўваюць самі чытачы, — вельмі жаданымі становяцца перавыданні любімага і працяг той ці іншай серыі. Шмат праектаў ініцыіруюць самі выдаўцы — такім чынам яны дэманструюць свае магчымасці і дапамагаюць аўтарам (хоць пытанне, хто і каму дапамагае, дастаткова спрэчнае). Аднак з'яўляюцца выданні, якія зусім не чакаеш, — яны падрыхтаваны для чытача з даволі спецыфічнымі інтарэсамі, дасведчанага, зацікаўленага і глыбока неабыякавага да таго, што адбываецца далёка за межамі краіны.**




Так, для многіх стане сапраўднай нечаканасцю манаграфія «Мастацкая крытыка Кітая ХХ — пачатку ХХІ стагоддзя ў кантэксце развіцця сучаснага мастацтвазнаўства». Аўтар — кітайскі даследчык Лі Лэй, выпускнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і кандыдат мастацтвазнаўства. Не зусім звычайнае для Беларусі даследаванне толькі адной назвай можа зацікавіць студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, выкладчыкаў творчых ВНУ, спецыялістаў у галіне мастацтвазнаўства. Кніга, натуральна, адрасавана тым, хто цікавіцца традыцыйнай і сучаснай культурай Кітая.

Манаграфія — першае ў беларускім і кітайскім мастацтвазнаўстве комплекснае даследаванне развіцця мастацкай крытыкі Кітая ў ХХ — пачатку ХХІ стагоддзя. «У ім упершыню выяўлены і ахарактарызаваны вытокі і формы кітайскай мастацкай крытыкі, выдзелены і абгрунтаваны межы сучаснага гістарычнага перыяду мастацкай крытыкі, вызначаны адметныя асаблівасці, ахарактарызавана практыка развіцця музычна-крытычнай думкі ў кантэксце функцыянавання сучаснага мастацтвазнаўства», — адзначаецца ў анатацыі. Між тым пра важнасць падобнага даследавання разважае ў сваёй прадмове Барыс Святлоў, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт. Найперш даследчыка цікавіць само паняцце крытыкі, яго трансфармацыя. Перыядызацыя, спасылкі, цытаты — усім гэтым Барыс Уладзіміравіч імкнецца падмацаваць сваё меркаванне і пераканаць чытача. «Пачынаючы з канца ХІХ, усё ХХ стагоддзе і ў пачатку ХХІ стагоддзя айчынная і кітайская мастацкая крытыка развіваліся як бы ў адным кірунку, чаму спрыяў культурны абмен паміж нашымі краінамі, які ўсё больш узмацняўся, і ажыццяўленне агульных камуністычных ідэалаў, — піша аўтар прадмовы. — Адрозненне заключалася ў тым, што кітайцы ведалі аб працэсах, якія адбываліся ў нашай мастацкай практыцы і тэорыі больш, чым мы ведалі аб тым, што адбывалася ў гэтай сферы на прасторах Паднябеснай. У той жа час паняцця “беларускага мастацтвазнаўства і мастацкай крытыкі” для іх не існавала. І нават калі яны ведалі пра “Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва” Міколы Шчакаціхіна, то ўсё гэта было аднесена імі да раздзела вялікага савецкага мастацтва».

Чым жа, на думку Барыса Святлова, цікавая манаграфія Лі Лэя? Па-першае, даследаванне абапіралася на працы беларускіх тэарэтыкаў, гісторыкаў, мастацкіх крытыкаў і практыкаў розных відаў мастацтва. Па-другое, яно было арыентавана на тыя навуковыя колы Кітая, якія цікавіліся мастацкай культурай нашай краіны. Па-трэцяе, Лі Лэй увёў у навуковы абарот шэраг тэкстаў і імёнаў выдатных кітайскіх даследчыкаў мастацтва — дзеля зацікаўленасці беларускіх навукоўцаў. Кандыдат філасофскіх навук упэўнены, што выданне манаграфіі «Мастацкая крытыка Кітая» — даўно чаканая і неабходная вяха на шляху развіцця беларуска-кітайскіх культурных адносін.

Кітай наблізіўся да рысы вялікіх змяненняў у сферы мастацкай культуры. Аўтар прадмовы даволі катэгарычна выказваецца пра некаторыя з'явы культурнага жыцця краіны, падкрэслівае неабходнасць кантролю з боку дзяржавы, акцэнтуючы ўвагу на тэзісе: мастацкая крытыка заўсёды была з'явай не толькі эстэтычнай, але і палітычнай. З гэтым ён і пакідае чытача, завяршаючы прадмову гаворкай пра важнасць стварэння і ўзаемаўзбагачэння культур.

«Мастацкая крытыка Кітая ХХ — пачатку ХХІ стагоддзя ў кантэксце развіцця сучаснага мастацтвазнаўства» Лі Лэя — размова пра мастацкую крытыку (у першым раздзеле абагульняюцца звесткі пра сутнасць, функцыі, тыпалогію жанраў у еўрапейскім мастацтвазнаўстве), а таксама пра фарміраванне мастацтвазнаўства і развіццё мастацкай крытыкі ў Кітаі (другі раздзел змяшчае інфармацыю пра вытокі і формы вывучэння мастацтва да ХХ стагоддзя, вызначэнне меж гістарычнага перыяду сучаснай кітайскай мастацкай крытыкі і выдзяленне сутнасці яе развіцця). Найбольшую цікавасць выклікаюць трэці раздзел — «Прынцыпы функцыянавання мастацкай крытыкі ў сучасным Кітаі ў кантэксце агульнасусветнага развіцця мастацтвазнаўства» — і заключэнне. Напрыклад, адной з адметных асаблівасцей сучаснай кітайскай мастацкай крытыкі аўтар называе прыцягненне і выкарыстанне ў практыцы метадаў сацыяльнай крытыкі заходняга мастацтва, крытычнай канцэпцыі марксізму і прынцыпаў сацыялістычнага рэалізму. Інтрыгуе?

**Яўгенія ШЫЦЬКА**

# Роднае, паэтычнае…

**Выдавецтва «Беларусь» працягвае выпуск серыі, назва якой гаворыць сама за сябе — «Кніжная паліца школьніка». Адна з новых кніг, што з'явілася ў ёй, — «Родныя словы». Бадай, лепш і не прыдумаеш. Словы родныя, бо з маленства гучаць на мове дарагой. Той, якая заўсёды хвалюе. Ёсць магчымасць словамі блізкімі і зразумелымі выказаць тое, што непакоіць, а сэрца радуе. Да чаго душа імкнецца.**

Укладальнік Сяргей Моўчан пад адной вокладкай сабраў творы трох паэтаў, якія належаць да кагорты тых, хто з'яўляецца гонарам беларускай літаратуры. Дасведчаны чытач, разгарнуўшы кнігу наўгад, не зазіраючы ў змест, нават па асобных творах лёгка здагадаецца, хто напісаў верш, што даўно стаў хрэстаматыйным.

Аўтар першы — «Александрына»:

*Мне не забыцца песні той даўняй вясны:*
*— На Мурамскай дарожцы стаялі*
*тры сасны…*

*Хадзілі мы, спявалі, і з песняй ты цвіла.*
*Александрына, помніш, якою ты была?*
*……………………*
*Прайшлі вясна, і лета, і восень, і зіма…*
*Александрына, дзе ты?*
*Шукаю я — няма…*

Другі аўтар — «О Беларусь, мая шыпшына»:

*О Беларусь, мая шыпшына,*
*зялёны ліст, чырвоны цвет!*
*У ветры дзікім не загінеш,*
*чарнобылем не зарасцеш.*

*Пялёсткамі тваімі стану,*
*на дзіды сэрца накалю.*
*Тваіх вачэй — пад колер сталі —*
*праменне яснае люблю.*

Нарэшце, аўтар трэці — «Бывай…»:

*Бывай, абуджаная сэрцам, дарагая.*
*Чаму так горка, не магу я зразумець.*
*Шкада заранкі мне, што ў небе дагарае*
*На ўсходзе дня майго, якому ружавець.*

*Ці помніш першае нясмелае прызнанне?..*
*Над намі жаўранкам звінеў і плакаў май.*
*Назаўтра золкае, туманнае світанне,*
*Суровы позірк твой і мой нямы адчай.*

Канешне ж, паэты гэтыя — Пятрусь Броўка, Уладзімір Дубоўка і Аркадзь




Куляшоў. Калі ж хто з юных чытачоў не ведаў аўтарства, дзякуючы кнізе «Родныя словы», запомніць, хто і які твор напісаў. У зборніку сабрана найбольш значнае са створанага кожным з іх. Невялікія біяграфічныя звесткі разам з прадстаўленымі творамі дазваляюць адчуць, у чым адметнасць таго ці іншага творцы.

Пятрусь Броўка, напрыклад, прадстаўлены не толькі найлепшымі сваімі вершамі, але і паэмамі «Беларусь» і «Голас сэрца». У першай з іх — прачулыя радкі пра нашу родную старонку, другая прысвечана маці Пятра Усцінавіча. Алена Сцяпанаўна ў гады Вялікай Айчыннай вайны разам з землякамі з вёскі Пуцілкавічы Ушацкага раёна была вывезена ў лагер смерці Асвенцім. Загінула ў 1943 годзе, здзейсніўшы, па сутнасці, подзвіг. Ахвяравала сабой, каб выратаваць 14-гадовую дзяўчынку з суседняй вёскі.

Вершамі, паэмай «Кругі» прадстаўлены і Уладзімір Дубоўка. Творы, як і ў кожнага паэта, розныя, але ў шмат якіх тое, чаго ў іншых няма. Хоць і не заўсёды адкрыта, але ўгадваецца перажытае. Гучыць і аптымізм, які дапамагаў яму выжыць на нялёгкіх пуцявінах.

Надзіва прадстаўнічая падборка Аркадзя Куляшова. Не ў апошнюю чаргу за кошт таго, што багата прадстаўлена яго грамадска-патрыятычная лірыка. А гэта вершы «Над брацкай магілай», «Камсамольскі білет», «Ліст з палону», «Балада аб чатырох заложніках», паэма «Сцяг брыгады», у якіх гучыць тэма Вялікай Айчыннай вайны. Поруч «Маналог», прысвечаны памяці сяброў-паэтаў Змітрака Астапенкі і Юлія Таўбіна.

**Еўсцігней ДРОМІН**

# Сонца на далоні

**Проста — не значыць спрошчана. Магчыма, гэта праяўляецца і не заўсёды, але ў творах для дзяцей дае жаданы вынік, калі аўтар стараецца глядзець на навакольны свет так, як глядзяць яны самі. Са здзіўленнем, бо пры ўважлівым назіранні ён здатны ў самым звычайным паднесці тое, што інакш, як дзівосамі, не назавеш. З усведамленнем, што хоць пра гэта гаварылі і іншыя, так, як ты сказаў, ніхто зрабіць не можа. Ды яшчэ і так, каб і іншым захацелася гэтаму ў цябе павучыцца.**

Што такі падыход не толькі апраўданы, але і плённы, упэўніваешся, чытаючы кнігу Вольгі Любашынай «Разноцветные лошадки», выпушчаную выдавецтвам «Беларусь». Гэта назіраецца пачынаючы з верша «Карандаш», якім яна адкрываецца.

Ён прываблівае ўжо тым, што напісаны ад першай асобы. Такі прыём заўсёды дае жаданы вынік, калі ў ім «я-герой» (у дадзеным выпадку дзяўчынка) прамаўляе ўсё не голасам аўтара, высновы якога хоць і правільныя, але, як здаецца даволі часта, занадта павучальныя. І ў той жа час пазбаўленыя шчырасці, непасрэднасці, што характэрна для дзіцяці. Чытаючы ж верш Вольгі Любашынай, яскрава ўяўляеш дзяўчынку, якая ў звычайным алоўку бачыць магчымасць здзейсніць тое, што ў дадзены момант яе цікавіць. Яна не перажывае, што не ўсё адразу атрымліваецца. Разумее, што пры жаданні ўпушчанае лёгка навярстаць.




Вольга Любашына ў сваіх творах закранае розныя тэмы. Аднак, пра што б ні пісала, гаворыць пра блізкае дзецям. Звязанае з іх паўсядзённымі справамі. Часта ў маленстве жывымі ўспрымаюць звычайныя цацкі. Без іх дзеці не ўяўляюць сваё жыццё. Як хлопчык з верша «На подушке у Андрюшки». Чаго толькі ў яго няма? Машынка, мядзведзік, кацяня, слананя… Шкадуе толькі, што падушка невялікая і ўсё на ёй не ўмяшчаецца. Яшчэ адзін хлапчук занятыя лепкай з пластыліну («Симпатичный дельфин», «Златовласый пингвин»). Цікава напісаны верш «Дрёма»: «Возле дома бродит дрёма // И стучит в окно дождём. // По квартире ходит Тома. // Томе дрёма нипочем». Толькі дрымота ад дзяўчынкі не адстае: «Сон на Тому нагоняет — // Сразу хочется зевать. // Кошка сладко засыпает. // Что ж, пора и Томе спать». Ёсць у зборніку і калыханка «Баюшки-баю», ёсць языкаломкі. Вершы з усмешкай і без яе.

Светлай, харошай атрымалася кніжка. Успрымаецца як тое сонейка, якое, нечакана выглянуўшы, узнімае настрой. Дарэчы, адзін з вершаў так і называецца — «Солнце на ладошке». Як і «Карандаш», яно нагадвае споведзь маленькай гераіні. Нездаровіцца ёй, але яна забывае пра сваю хваробу, убачыўшы сонечны праменьчык, што нечакана з'явіўся на сцяне. Упэўнена — хутка паправіцца:

*Светит солнце сквозь оконце.*
*Я болею. Грустно мне.*
*Золотистый лучик солнца*
*Появился на стене.*
*По спине погладил кошку,*
*Перебрался на кровать,*
*На ковровую дорожку…*
*Как его мне удержать?*
*«Посиди со мной немножко*
*И чуть-чуть меня согрей, —*
*Нежно глажу луч ладошкой. —*
*Лезь за пазуху скорей!»*

Творы ў кнізе цудоўныя, ды толькі не абышлося без недагляду. У вершы «Муссы на разные вкусы» ўнук, задаволены мусам з буракоў, якім яго пачаставала бабуля, абяцае ёй: «Я приготовить яблочный хочу. // Ты завтра насладишься новым вкусом». Абяцанне прамоўлена зусім не па-дзіцячы. А хіба можа сучасная дзяўчынка шукаць іголкі ў лесе, каб прышыць хвост ляснечаму ваўку («Оторвался хвост у волка»). Тым больш што ў вершы «Иголка» яна вышывае коніка, а ў творы «Вышивальщица» робіць для матулі букет-вышыванку. Канешне, без «лясных іголак».

Толькі гэта ні ў якім разе не псуе агульнага ўражання ад кнігі «Разноцветные лошадки», напісанай для дзетак з добрым веданнем іх псіхалогіі.

**Міхась ЯРОМКА**

# Прывід ведае шмат

**Калі коратка адказаць на пытанне, якія кнігі дзеці асабліва любяць, то адказ хутчэй за ўсё будзе толькі адзін: цікавыя. Хлопчыкам і дзяўчынкам не так і важна, пра што піша той ці іншы пісьменнік. Не надта задумваючы яны, ці адпавядае гэта таму, з чым яны сутыкаюцца штодня. Галоўнае, каб пра гэта пісалася так, што ад чарговай старонкі было не адарваць, хацелася як мага хутчэй даведацца, што будзе адбывацца далей. Менавіта так і піша Дмітрый Мікалаеў, што добра відаць па яго кнігах, якія выйшлі ў выдавецтве «Беларусь».**




Першая з іх — «Приключения любопытного волчонка» — па змесце самая што ні ёсць традыцыйная. І раней нямала было твораў, у якіх расказвалася пра жыццё ваўчаняці. Толькі Дзмітрый Мікалаеў не паўтарыў сваіх папярэднікаў, а знайшоў новы сюжэт пра таго, каго інакш, як драпежнікам, асабліва ў казках, не ўспрымаюць. У выніку атрымалася шчымлівая гісторыя пра ваўчаня, якое шукае сабе сяброў.

У казцы ж «Питер, Лейла и кристаллы добра» паварот сюжэта вызначаецца навізной, а створанае багатай аўтарскай фантазіяй выклікае цікавасць нават у дарослага чытача. Хоць спачатку не столькі гэта прыцягвае ўвагу, а тое, што дзеянне твора, як сказана ў самым пачатку яго, адбываецца ў адной з еўрапейскіх краін: «Великобритания. Окраина города Брайтон. Дом миссис Сары Дженкинс. Наши дни».

Нельга забываць, што Англія — краіна замкаў. Калі ж іх побач не знаходзіцца, то старых дамоў усё больш чым дастаткова, а дзе старыя дамы, там і легенды, звязаныя з імі, неверагодныя гісторыі. Прывід жа можа шмат расказаць, як відаць з гэтай казкі Дзмітрыя Мікалаева.

Дзеянне ў ёй пабудавана так, што неверагоднае, тое, у рэальнасць чаго ніяк не хочацца верыць, паўстае настолькі праўдападобна, нібыта адбываецца наяве. Несумненна, гэтыя дзівосы выклікаюць у дзяцей малодшага школьнага ўзросту, а ім у першую чаргу адрасавана казка, не проста захапленне. Яны, дзякуючы прадуманасці сюжэта, па сутнасці, стануць удзельнікамі таго, з чым сутыкаюцца галоўныя героі Пітэр і Лейла.

Гэтаксама, як і персанажы, будуць у захапленні ад таго, чаго ў рэальнасці няма. Напрыклад, кій ад більярда, які без чыёй-небудзь дапамогі ўзняўся ў паветра. Ды каб толькі гэта! Усё і пералічыць немагчыма. Разам з тым адбываецца і больш важнае: падарожжа ў часе. Героі пераносяцца ў 2022 год да нашай эры. Чаму менавіта ў гэты перыяд, хай для чытачоў, якія пакуль не пазнаёміліся з творам, будзе загадкай.

Аднак своеасаблівай адгадкай успрымаецца магічная сумка з поясам, што валодае вялікай сілай. Новая казка Дзмітрыя Мікалаева тым і прываблівае, што дзякуючы фантастычнаму сюжэту, з заглыбленнем у гісторыю, паспяхова вырашае важныя выхаваўчыя мэты, адным са складнікаў якіх з'яўляецца і пошук дабра ў самым шырокім значэнні слова. Да гэтага па сюжэце твора і імкнуцца Пітэр і Лейла, праходзячы праз шматлікія выпрабаванні і дасягаючы поспеху.

Перагортваеш апошнюю старонку з упэўненасцю, што, магчыма, у гісторыі будзе і працяг. Пітэр гаворыць Лейле, што, як ён даведаўся ад аднакласніка, дом з прывідамі ёсць і ў Вултане. Дзяўчынка спачатку сустрэла гэтае паведамленне без энтузіязму, а пасля зацікавілася. Аднак, як бы там ні было, падарожжа ў даўнія стагоддзі Пітэру і Лейле шмат дало. Без сумнення, такім яно будзе і для дапытлівага юнага чытача.

**Ганна ІВАНЕЙ**



## Валянціна ДРАБЫШЭЎСКАЯ
Мінск

### Маё жыццё зусім як восень

*Маё жыццё зусім як восень:*
*То ясны, то самотны дзень…*
*Смяецца вераб’ём, галосіць*
*Пужлівай чайкай на вадзе.*

*То разгуляецца, як вецер,*
*І затрашчыць сухім галлём*
*Ці супакоіцца, як дзеці,*
*Пад калыханку перад сном.*

*А то ў архангельскім убранні*
*Б’е пазалотай па вачах*
*І шчодра рассыпае раннем*
*Грыбніцы ў сцішаных лясах.*

*Ці зацвіце неспадзяванкай*
*Перад марозам на градзе,*
*Ці чорнай хмарай, як цыганка,*
*Пярсцёнак-сонейка ўкрадзе.*

*То, як пунсовая рабінка,*
*Стаіць сярод нявест-бяроз*
*І заплятае павуцінкай*
*Сталеючую прыгажосць.*

*…Аб чым у дрэва лісце просіць,*
*Калі кладзецца на траву?*
*…Маё жыццё зусім як восень,*
*Таму, напэўна, і жыву.*

### Каб узвышанае адчуць

*Абдымі мяне, абдымі!*
*Пацалуй мяне, пацалуй!*
*Патанула я ў дабрыні —*
*У запале цяпер ратуй!*

*Ты — сардэчка майго цяпло!*
*Ты — рамана майго працяг!*
*Сам Анёлак Святым Крылом*
*Прапісаў наш жыццёвы шлях.*

*Не хвалюйся і не тужы,*
*Каб узвышанае адчуць!*
*Смак сунічак, чарніц, ажын*
*Мае вусны табе нясуць!*

*Будзе хата і будзе хлеб,*
*Велікодзень, Раство, Куцця…*
*Бо над хмарай зямных патрэб —*
*Свет прапісанага жыцця!*

### Калі пустэча ўсё

*Калі пустэча ўсё, і ты сама ў пустэчы,*
*Ахоплівае жах напружаныя плечы,*
*І проста пад адхон нядбайнае жыццё…*
*Калі пустэча ўсё, калі пустэча ўсё…*

*Адзінае тады — малітва і папера!*
*З нязведаных краёў —*
*не рэчыўнае — вера*
*Праз тонкі капіляр мне напаўняе сэрца,*
*І ад наплыву мар няма куды падзецца.*

*Хвалюючца радкі,*
*як белы ліст парушыць,*
*Каб потым праз вякі святлом гаюча*
*ў душы*
*Праліцца?!*
*Я цяпер высока над пустэчай*
*І з годнасцю іду дарогай Чалавечай.*

### У Купальскую ноч

*У Купальскую ноч, у загадкавую,*
*незвычайную*
*Таямніцай жыцця кветка-папараць*
*дзіўна цвіце.*
*Разгараецца вогнішча, яркае,*
*выратавальнае,*
*І натхненне ад полымя ў сэрцы*
*людскія ідзе.*

*Неўміручы Купала!*
*Імя яго вершамі ўплецена*
*У абрысы гісторыі маці-радзімы навек!*
*І лучыны паэта стагоддзем свято*
*не замецена,*
*Бо адвечную песню заўсёды пяе чалавек.*
*Дзе радок да радка —*
*успамінаў курган узвышаецца,*
*Над свабоднаю спадчынай мроі*
*лунаюць часцей…*
*А Купалава вогнішча ярка штогод*
*разгараецца,*
*Каб будзіць патаемнае ў душах*
*тутэйшых людзей!*



Фота Кастуся Дробава.

## Памяці Анатоля Казлова

### Дар’я ЛЁСАВА

* * *

*А ў вёсцы Асінаўка сёння снягі*
*Засыпалі ўсё наўкола.*
*Горка мне сёння ад белай тугі,*
*Ад голага поля.*

*Неба, вярні сюды ўсё, што было,*
*Хаты вярні, гаспадынек!*
*Чую: ідзе Анатоль Казлоў*
*Да роднага дыму.*

*Хавае слязу, хоць нікога няма,*
*Адзін паміж крутаверці.*
*Столькі гадоў Чарнабылля зіма*
*Лютуе над сэрцам!*

*Ціха, зямелька, і ты не гудзі,*
*Не шкодзь свайму сыну!*
*Ён песню нясе ў зелянцовым лісці*
*Пра Маму сваю — Айчыну!*

### Уладзя ПРОН

* * *

*І кнігаўка твая, згубіла што гняздо,*
*Не просіць больш «Я піць хачу»;*
*І жораў твой ляціць цяпер да Бога,*
*Дый не апаліць ён імклівае крыло,*
*Бо любіць Бог тваё душэўнае свято,*
*Што саграваla кожнага — сястру,*
*Сяброў і тых, хто гутарыў з табою,*
*Каму падставіў ты сваё плячо…*
*Больш не журчыць*
*Празрысты твой ручэй,*
*Самотна капае крыніца,*
*І кнігаўка не просіць «Піць хачу»…*

### Віктар ЯРАЦ

* * *

*На развітанне слоў не носяць многа.*
*Часцей — і позірку даволі.*
*У белай далечы дарога*
*Ці ў агеньках стамлёнай долі?*

*Жывым распытваць пра жывое.*
*Ты быў жывым і варажыў*
*З вакзальным ветрам неспакою*
*На скразняках душы…*

---



## Віктар ЯРАЦ
Гомель

### Замоленыя саставы

*Вязлі вагоны юнакоў бязвусых*
*ад енісейскіх, волжскіх берагоў*
*на рубяжы агню, і сосны Беларусі*
*жадалі ім вярнуцца ўсім дамоў.*
*І рэкі ціхія, кантужаныя гулам*
*варожых бамбавозаў, ноччу й днём*
*малітвы пасылалі, як матулі,*
*пад хмарамі —*
*быў хросны для іх гарматы гром.*
*Агорнутыя горыччу хатыняў,*
*вязлі руінаў, папяліішчаў гнеў*
*саставы ў дыме вугальным*
*і з той цыгаркі-самакруткі дымам,*
*якой дзяліцца ўмелі на вайне.*

* * *

*Сад спавіты густой цішынёй.*
*Пуста ў гнёздах. Ні голасу птаха.*
*Пад лістком, не сарваным*
*халоднага неба рукой,*
*гук заблудзіўся*
*і зачапіўся за сук*
*пілігрымам з якой дарогі?*

### Азімут гукаў

*На яблыню даўняга саду,*
*толькі голькі цяплом закране,*
*без падказкі чужой і парады*
*птах ляціць, як раней, як раней.*

* * *

*Ломяцца ветрам крыгі вясной,*
*ветрам ірвуцца аблокі-палотны.*

*Начны неспакой*
*хоць аблачынкай малой*
*не знікае і за світальнай вярстой*
*на сонечных паваротах…*

### Вектар

*Жыві, паэзія камерная,*
*толькі без камер турэмных, —*
*з тайнаю гнёздаў у травах,*
*з тайнаю гнёздаў на дрэвах.*

* * *

*Буслы на стрэхах саламяных засталіся*
*сыпаць клёкат на зялёны мох*
*толькі ў перагукванні эпох,*
*што вандруюць воблакамі ў высях.*

* * *

*Дняпро і Сож, як дзве мае рукі,*
*якімі родны свет я абдымаю*
*зімой, калі пад лёдам прыціхнуць*
*шчупакі,*
*і ў дні, калі гуляе лешч у маі.*

*Зблднее рэчак сіла-глыбіня —*
*пытаць пасля ўпустую:*
*— Чыя віна?*

* * *

*…адсталая ад крыгаходу*
*крыга нясе каму*
*ўспаміны чые пра годы*
*і чый успамін — пра зіму?*

### На схіле зімы

*Сонца яшчэ на гітарах галін*
*не разбудзіла ні гуку мелодый.*
*Высь — дырыжор, закрані карані, —*
*гнёзды ў чаканні чародаў…*

* * *

*А словы ўсіх песень, саграэтых у леце,*
*помняць і ў сцюжу птушкі і вецер.*

### Неадселеная студня

*Тая студня,*
*дзе сонцу і зорам, і маміным рукам*
*варажыла вада, наталяе асмяглыя згадкі.*

* * *

*Саставы неспакою, гружаныя вясною, —*
*воблакі.*

* * *

*Асфальт не мае памяці.*
*А тая*
*грунтовая дарога, па якой*
*хадзілі продкі, кліча небакраі*
*і з далячыняў летам і зімой.*

* * *

*Маўчаннем запыталіся сініцы:*
*— Каму і ў позні час ніяк не спіцца?*
*Відаць, на вецці ведаць ім цікава:*
*што ў кубку на стале — ці чай, ці кава?*

* * *

*Зайчыкі чакання скачуць*
*на сцяне, і сонца круг*
*круціць вышыню на ўдачу*
*славіць раніцу без гучных труб.*

### Соль

*І ў свеце на хісткіх падмостках,*
*на зыбкай платформе зямной*
*дзень прагне вітаца*
*не свечкамі з воску,*
*не сумных нябёс вышынёй.*
*Бадзёрай усмешкі, гуллівага тону*
*так хоча заўсёды глядач — дай яму*
*з экрана, са сцэны без кроплі салёнай*
*хоць жарцік, як фанцік,*
*хоць байку — халву.*
*На зерне, што з пылам,*
*няпростага сказу*
*не любіць кляваць Homa Sapiens — ён*
*да меж да якіх аб’явіў марафон*
*камп’ютарным гульням?*
*Няўжо — да маразму?*
*Шэкспірам з арбіты якой адгукнецца*
*нялёгкае слова без грыму — як боль*
*руін землятрусу і войнаў?*
*А соль*
*вякамі раднілі з хлебам на свеце…*

### Піраміда часу

*А ці кожнага помніць,*
*хто ў бязмежжа маўчання пайшоў,*
*воблік, дыханне і словы*
*вецер — ён ходзіць кругамі ў вяках,*
*як цыганка па парку,*
*што наіўныя позіркі ловіць*
*і даверлівым абяцае з казырнаю*
*картаю шлях?*
*І ўсё меней штогод адрасоў, на якія*
*пісьмы слаў і паштоўкі.*
*І ўсё меней нумароў*
*тэлефонаў знаёмых.*
*А світанне на вокнах піша*
*літары залатыя*
*і цалуе імёны і бацькоў,*
*і жанчын самых светлых,*
*і праверaных на трываласць,*
*надзейнай за гранітныя глыбы, сяброў.*



# Будзем здаровыя,
## альбо Пра чарамшу і грэцкія арэхі

*Гумарыстычнае апавяданне*

**Васіль НАЙДЗІН**

Не ведаю, колькі вам гадоў, а мне дык нядаўна шэсцьдзясят стукнула. Фірма, у якой я ледзь не даклыпаў да пенсіі, падарунак зрабіла — туалетную ваду. І ў дадатак — гальштук. Доўгі такі, як вяроўка. Што мяне і насцярожыла. Але супакоіла Аліса Варфаламееўна, сакратарка шэфа: маўляў, Іван Іванавіч, які ў тэрміновай камандзіроўцы, прасіў перадаць, што Зяблікаў — гэта я! — няхай і надалей цягне свой воз. Па новых законах і правілах яму яшчэ рана на пенсію. А там, будзем жывыя, усё зробім па-людску…

Такая інфармацыя мяне нават узрадавала, і я тут жа напісаў заяву. З просьбай даць мне тэрміновы адпачынак, на тыдзень. За свой кошт, зразумела. Каб адхліпнуцца, набрацца сіл перад новым, таксама напружаным перыядам жыцця, у тым ліку і працоўнага.

Ліса-Аліса пачытала заяву і запэўніла: «Іван Іванавіч падпіша, даю гарантыю. Вы толькі, таварыш Зяблікаў, пару слоў дабаўце… без аніякай, маўляў, матэрыяльнай дапамогі. І смела гуляйце з заўтрашняга дня. А ўлічваючы просьбу калектыву, пасля вашых гарбаты-кавы, якімі вы быццам сёння плануеце стол «накрываць» ды нас частаваць у абедзенны перапынак, можаце адразу і сёння адчальваць.

Настрою ў мяне яшчэ больш дабавілася. Дамоў захацелася не ісці, а ляцець. Праз якую гадзіну я ледзь таксі не выклікаў. Але з такімі падарункамі ў легкавік садзіцца… Абыдземся без яго. Тым больш калі ідзеш, лепш нейк пра ўсё думаецца. Разумныя думкі самі ў галаву лезуць, без аніякай напругі, каманды. Цвярозым, і нават без «заправкі» півам, думаю, трэба хоць раз у жыцці ў пятніцу ў хату ўваліцца. А планаў на найбліжэйшыя дні — мора! Як бы ў їм не ўтапіцца…

Як «пялёскалася» гэтае мора ў наступныя дні, расказваць падрабязна не буду. Не той зараз час, каб марнаваць хвіліны на дробязі. Выхаплю галоўнае. Пагудзелі, значыць, з нагоды майго юбілею з родзічамі і знаёмымі ў надзейным месцы дні чатыры, і пачаў я разважаць і думаць па-сур'ёзнаму. Немалады ўжо, думаю. Не сорак, разважаю. Нават не пяцьдзясят… Не паляціш, як раней, птушкай на трэці паверх сваёй кватэры. Не памчыш па вуліцы хутчэй за трамвай. Але ж яшчэ і не семдзесят. Ды навошта ляцець і мчаць на пятай хуткасці на верхатуру, любую! Не хуткасцьвёрткасць у нашым узросце галоўнае. Здаровым і дужым увогуле хочацца быць. Хаця б па асноўных параметрах. Да сотні вунь яшчэ як далёка… Але навошта да кругляка мучыцца — хопіць і да 99. Надакучылі гэтыя юбілеі, новыя клопаты. Тым больш у наш час робіцца ўсё хутка, спехам. А навошта той галоп! Не спяшаючыся трэба, з розумам…

Да гэтага я і імкнуся. Бо немалады ўжо.

Тут і артыкул цікавы мне нехта падсунуў. У дні, калі юбілей адзначалі. Вялізны — паўдня чытаў. А калі коратка сфармуляваць тыя думкі «вегетарыянца», атрымліваецца наступнае: харчуйцеся, людзі, выключна раслінnай ежай і будзеце здаровыя як коні. І прыклады з высновамі, тлумачэннямі — чаму, маўляў, шмат доўгажыхароў на Каўказе, іншых цёплых зямных куточках. Бо малочна-раслінная ежа там у павазе.

А што яшчэ цікава: у вегетарыянцаў і творчыя здольнасці на недасягальнай вышыні. Прыхільнікамі раслінnай ежы былі Піфагор і Сенека, Платон і Леанарда да Вінчы, Байран і Леў Талстой. Па іх шляху ў пытаннях харчавання пайшлі і вядомыя спартсмены, інжынеры-канструктары, нават палітыкі.

Трэба, думаю, і сабе за розум брацца. Пакуль не позна.

Карацей кажучы, узяў я ладны мех — і на рынак.

У трамваі той цікавы артыкул яшчэ раз прагледзеў. Аказваецца, грэцкі арэх па каларыйнасці пераўзыходзіць пшанічны хлеб у тры разы, бульбу — у сем, малако — у 11, грушы — у 15 разоў… Па пажыўнасці адзін кілаграм грэцкага арэха замяняе прыкладна кілаграм мяса, кілаграм рыбы, літр малака, кілаграм груш — разам узятыя.

Вось што, разважаю, трэба есці! А не біфштэксы з катлетамі. На першы выпадак, планую, кілаграмаў пяць куплю гэтых арэхаў, а там пабачым…

Калі нёс іх ужо дамоў, суседа сустрэў. Маладзейшы за мяне, на тры месяцы. Але таксама разумны. Мабыць, як той Піфагор і Сенека… Валёнак Мацвей Патапавіч — па пашпарце.

Разгаварыліся. Расказаў, адкуль іду, што купіў і навошта. Ва ўсім падтрымлівае мяне сусед.

— Усё тое, што расце ў садзе і агародзе, лесе, на лузе і на полі, — гэта сіла, здароўе і розум! — вучыць мяне Мацвей Патапавіч, хоць па мянушцы і Валёнак. — І грэцкія арэхі на самай справе — гэта цуд! Еш іх тры разы на дзень і будзеш здаровы як бык. А каб не на сухамятку — запівай японскім грыбам. Надае бадзёрасць, распаляе апетыт.

— А дзе ж яго ўзяць? — пытаюся. — Не на край жа свету па грыб гэты ехаць.

— Дык ён у многіх ёсць. Па-рознаму толькі завецца — чайны, японскі, маньчжурскі, кітайскі. На лепш пачытай…

Гляджу я ў шматок газеты, які ўсучыў мне сусед, і дзіўлюся. Аказваецца, гэты самы чайны грыб утрымлівае такія па хімічным саставе злучэнні, як кафеін і катэхін, вялікую колькасць вітамінаў, сярод якіх асабліва шмат аскарбінавай кіслаты, нейкіх тыяміну і рыбафлавіну… Усё разам узятае — страшэнны вораг ангіны, атэрасклерозу, гіпертаніі і многіх іншых хвароб. Больш за тое — цуд-грыб валодае танізуючым, заспакаяльным і агульнаўмацоўвальным дзеяннем, здымае фізічную і разумовую стому.

— Вось гэта стварэнне прыроды! — гляджу я ў рот суседу.

— А маладыя порхаўкі спрабаваў?

— Чортавы табакеркі?!

— Яны самыя.

— Па іх нагой як дасі — парахня цёмная сыплецца…

— Гэта калі грыб стары. А маладыя і сушыць можна. Самыя смачныя і пажыўныя грыбы! Па ўтрыманні бялку пераўзыходзяць нават баравікі… Дарэчы, калі маладую порхаўку разламаць — яна што сыр — і прыкласці да раны — адразу спыніцца крывацёк і сціхне боль.

— Надыдзе лета — назбіраю мех, — арыентуюся я, як магу, у багатай інфармацыі.

— Жэньшэню дастань, вясной на чарамшу не забывайся. Тады ўспомніш, для чаго жонка трэба. І яна ў настроі будзе…

— Ты гэта кінь, — спыняю Патапыча. Той усміхаецца.

— Даўно кінуў. А як наемся чарамшы ды прылягу са сваёй жоначкай — ярчэй сонца на небе свеціць, лепш, здаецца, грэе, хоць і праз акно. І знізу таксама…

Я на ўсякі выпадак пачаў кашляць.

Сусед адразу пакінуў сваю жонку ў спакоі:

— Ледзь не забыўся: вучоныя медыкі апошнім часам прыйшлі да высновы, што першы памочнік сэрцу — чарнасліў. Увесь камплект вітамінаў прырода ў ім схавала. Калі яго ўжываць рэгулярна, сэрца нармальна будзе біцца. І ўсё астатняе — працаваць-шавяліцца… Прабач, пад настрой вершы самі складаюцца. Пруць з галавы сваім ходам. — Мацвей Патапыч пацягнуў мяне за рукаў. — А цяпер пайшлі да мяне. Растлумачу, як абяцаў, чым адрозніваецца алоэ ад каланхоэ. Пакажу, як і на чым альяс настойваюць. У народнай медыцыне незаменная рэч…

З таго дня пачаў я з дапамогай розных каштоўных раслін, пладоў і траў набірацца сіл. Праз паўгода, адчуваю, здаровы ўжо як чорт! І галоўнае — у настроі. Увесь час!

— Што з вамі робіцца? — пытаюцца ў фірме, дзе я працягваю працаваць.

— Вы што маеце на ўвазе? — б'ю пытаннем па пытанні.

— Усе ідуць на працу як на хаўтуры, а вы — амаль з падскокам. Заўсёды бадзёранькі, вясёленькі. Нейк дзіўна на вас узрост дзейнічае. Можа, з доктарам якім трэба параіцца? Псіхолагам…

— Якім псіхолагам? — кажу. — Гэта вам усім не перашкодзіла б звярнуцца да спецыялістаў адной установы. Не скажу якой.

— Прабачце… А давайце зробім вылазку на прыроду, усім калектывам. Сам Іван Іванавіч прапаноўвае. Крызіс, кажа, у нас заканчваецца. Справы ў фірме пайшлі на лад. Мы хутка на святы і юбілеі не такія падарункі людзям рабіць зможам.

Не магу ўцяміць, куды гне ліса-сакратарка.

— …На прыродзе зараз такі цуд! Любата адна. Адкінем у бок вытворчыя справы, забудземся пра бытавуху. Заадно лепш прыгледзімся адно да аднаго.

Натапырыў я вушы, слухаючы Алісу Варфаламееўну. Няйнакш пра мяне думаюць усе тое, пра што і язык сказаць не паварочаецца.

— Даўно пара зрабіць прыцірку, — адказваю я, хаваючы малаток і арэхі ў кішэню. — Акрамя вітамінаў, свежае паветра чалавеку таксама патрэбна. Цішыня — таксама.

Тыдня не прайшло, як мы ўжо апынуліся «на прыродзе». Кажуць, прафсаюз пастараўся. Арганізаваў бы ён без Івана Іванавіча…

Але што мне да гэтага. Вы — камандзіры. У машыну — я ў машыну. За сервіраваны «стол», за які на траўку садзіцца трэба — калі ласка, мы не супрацьў. Можам і на каленках…

Калі ногі замлелі, праходжвацца пачалі.

Нармальна ўсё ішло. Прыгажосць! Лужок весь у кветках, непадалёк рэчка. Да яе мы неўзабаве і накіраваліся. На беражку расселіся. Той-сёй пачаў шкадаваць, што вуды не ўзяў. Чалавеку ж заўжды чагосьці не хапае. У першую чаргу прыгод. Па гэтай прычыне, а можа, і па камандзе, нехта ўнёс дурную прапанову: пабарайся, маўляў, паважаны Мікалай Фядосавіч — гэта я, — са сваім загадчыкам аддзела. Паглядзім, якую сілу далі вам кветкі-травы разам з арэхамі і настурцыяй.

Бачу, Іван Іванавіч таксама чакае нашых дзеянняў. Адступаць няма куды. Ды і Пётр Фядосавіч дае знакі рукамі, каб я да яго падыходзіў. Таксама ж начальства.

Трэба дык трэба.

Узяліся мы. Абшчапіліся…

Дзве ці нават тры рабрыны ў Пятра Фядосавіча і хруснулі.

Усе замітусіліся, на мяне глядзяць. Некаторыя нават пальцам паказваюць.

Зборы былі нядоўгімі.

Даём газу назад у горад. Па дарозе ў бальніцу ў канаву глыбокую трапілі. Я як схапіў за перадок машыну — нешта там і пагнулася. Матор, кажуць, з балтоў сарваў… Па мабільніках падмогу выклікалі. На «хуткай» ужо дамчалі куды трэба.

Спяшаўся непасрэднага свайго начальніка даставіць у палату — насілкамі дзверы паламаў. На руках, як дзіця, панёс яго ў рэанімацыю. Бягом. Дактары і медсёстры, гледзячы на такую карціну, з-за дрыжыкаў у руках доўга не маглі ўкол зрабіць небараку…

Адны непрыемнасці.

Навошта, думаю-разважаю, мне нагогул трэба было з такімі слабакамі на прыроду ехаць, тым больш — баруkaцца…

Жонка вэрхал узняла. Маўляў, чалавек ты ці хто?! Усе людзі як людзі! Жывуць, стараюцца, хварэюць… А ты па адваротным шляху ідзеш. Насуперак прыродзе. Хутка здзяцінішся…

У маёй левай руцэ, якую трымаў у кішэні, грэцкі арэх, можна лічыць, сам трэснуў. Так я напружыўся. Добра яшчэ з правай кішэні другую руку паспеў дастаць.

І з галавы словы калег не вылазяць: «Сіла ёсць — розум не трэба». Ды я ў сваёй галаве, мае вы даражэнькія, сотні, тысячы рэцэптаў-парад трымаю. Ведаю такое, што вам і не снілася.

Ды хто цябе сёння выслухае, зразумее?! Упікнуць, падкалупнуць, тут майстроў шмат: «Дужэйшы ён за ўсіх! Геракл… Лячыцца трэба».

Яшчэ глыбей я задумаўся. Сапраўды, адчуваю, нешта не тое са мной робіцца. Усе стараюцца, а я — наадварот! З-за гэтага многія сябры і знаёмыя перасталі ўжо за руку здароўкацца. Баяцца. Косці зараз у людзей не такія, як у дзядоў нашых былі. Але ж факт, што і я на прыродзе перастараўся. Калі Пётр Фядосавіч не паправіцца, дальбог з фірмы выпруць. Накрыецца медным тазам і пенсія… Трэба, думаю, брацца за розум.

Цяжкавата было перайначвацца, асабліва пераходзіць на звычайную ежу. Але потым пайшло-паехала. Няма біфштэксаў і бефстраганаў — такой бяды! Простыя катлеты падавай, жоначка. А сала з хрэнам ды з бульбачкай… Смаката! Шчыра кажучы, на многія парады і мудрагелістыя рэцэпты махнуў я рукой. Але яблыкі і чарнаслів ем штодня. А вясной — чарамшу абавязкова.

Праз год-два, разважаю, нармальным чалавекам зраблюся. Сёння ўжо першы раз у жыцці на прыём да доктара запісаўся.

## Тамара КРАСНОВА-ГУСАЧЭНКА:

# «Ратаваць словам! І, мне здаецца, гэта — нямала!»

**У Тамары Красновай-Гусачэнкі 1 красавіка 2023 года — прыгожая дата. Імя старшыні Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, аўтара шматлікіх кніг для дарослых і дзяцей вядома ў Беларусі і Расіі. Прызнанне яе творчасці — шматлікія высокія дзяржаўныя і літаратурныя ўзнагароды.**



*Фота з асабістага архіва Т. Красновай-Гусачэнкі.*

## Пра Радзіму

**— З чаго, па-вашаму, пачынаецца Радзіма?..**

— Прыгадваецца радок з майго верша, напісанага больш за 20 гадоў таму:

*Даже самая широкая дорога*
*Начинается от Отчего порога…*

Гэта і ёсць адказ на гэтае пытанне. Калі коратка. Радзіма пачынаецца ўсё ж не «з карцінкі ў буквары», літар у ім… Гэта потым… Пачатак — з першых усвядомленых пахаў роднай хаты, духмянага водару хлеба з печы, невымоўна ласкавых і родных гукаў голасу маці, яе крокаў, адчування сілы, упэўненасці і абароненасці: ад самых першых палётаў духу — калі бацька падняў цябе на рукі высока і моцна трымае над сваёй галавой — да тваіх уласных радасных — пад урачыстыя гукі на ўсё жыццё памятных святочных песень: «Забота у нас простая, // Забота наша такая, // Жила бы страна родная // И нету других забот….» Таму што Радзіма — самае галоўнае для кожнага на свеце. Таму што гэта — твая хата, твая матуля, тата, сям'я, школа, дзеці, ды і чытанка! І таварышы ў двары… І, галоўнае, мірнае неба над галавой, тваёй і ўсіх, хто жыве на Зямлі.

**— Каго вы з удзячнасцю ўспамінаеце?**

— Немагчыма нават у думках пералічыць усіх, хто адыграў у маім жыцці важную, вырашальную ролю — даваў цвёрдыя, але добра запамінальныя ўрокі, хто дапамагае цяпер, ратуе ад згубы фізічнай, духоўнай, маральнай, хто паказвае стваральны шлях…

Найперш згадаю, вядома, сваіх продкаў. Дзед Антон вучыў усведамляць свет, бачыць і ўяўляць яго, а затым і чытаць — па Біблії. На печы доўгімі зімовымі вечарамі, калі за вокнамі выла завіруха і завеі намяталі сумёты, вышэйшыя за саламяныя дахі вясковых хат, мне было з ім цёпла і ўтульна. І з гэтага таксама пачыналася Радзіма! Слухаючы Біблію, як ствараўся свет, у дзень першы… дзень другі… я падарожнічала ў сваім уяўленні далёка ад занесенай снегам вёскі ў такіх маляўнічых і яркіх кутках, якія не ўбачыш ні ў адным кіно…

Дзед Даніла, які выгадаваў дзіўны сад на гліняным, як лічылася, бясплодным узгорку, ператварыў яго ў рай зямны: грушы і яблыні, вішні і чарэшні, маліны і ажыны, слівы і жэрдэлі, а сартоў іх — не пералічыць... Яблыкі ад наліваў, што празрыста свецяцца на сонцы, да ружовых, малінавых. Грушы — памерам з кулак малатабойца! А бэзу… Ад белых да сініх і залацістых адценняў. Дзед быў майстар на ўсе рукі: умеў класці печы, займаўся шапавальствам, вырабляў скуры, шыў кажухі! Не было ў сялянскім побыце справы непадуладнай майстру Данілу... А маліўся як?! Мог прастаяць усю ноч каля ківота пасля найцяжэйшага працоўнага дня. Маліўся за сына Івана, які загінуў у першыя дні вайны, пакінуўшы сіротамі чацвярых дзяцей. Праз 40 гадоў пасля вайны знайшлі яго імя на помніку брацкай магілы пад Гомелем. А дзед колькі жыў — столькі чакаў…

Бабулі мае — Вера і Алёна — пралі і ткалі, шылі і вышывалі, пяклі і салілі… Расцілі гародніну і нарыхтоўвалі разнасолы так, што і па сёння не ела нічога смачнейшага і натуральнейшага, не апранала адзення больш ласкавага і прыгажэйшага, чым рабілі чароўныя рукі маіх бабуль.

Маці, бацька — проста гераічныя людзі. Калі гляджу старыя фатаграфіі — проста святыя аблічча, а не твары! Свецяцца, ясныя вочы, шчырыя, такой верай і любоўю напоўнены...

Бацька, Іван Антонавіч, у час вайны дайшоў ад вёскі Шчапіцына, што на Браншчыне, да Берліна і вярнуўся параненым, кантужаным — але жывым! Узначаліў калгас, якога, па сутнасці, не было. Хаты спалены, людзі, змучаныя, у асноўным старыя, жанчыны і дзеці, жылі ў згорбленых зямлянках... Трэба было адбудоўваць вёску, араць, сеяць — аднаўляць збалелую зямлю з попелу і руін… Здавалася, як? Нічога ж не было… Ні трактароў, ні машын — вазы ды напаўдохлыя коні, удовы і сіроты-дзеці…. Старшыня прыгожы, гарачы, але пакалечаны вайной. І вось жа — выдужалі!

Мама, Аляксандра Данілаўна, — настаўніца. Яна сама будавала з саману (гэта гліна з саломай) школу, насіла за 50 вёрст з раёна ўсё неабходнае для вучобы: падручнікі, сшыткі, крэйду, карты, глобус… Ад цяжкай фізічнай працы моцна захварэла і 30 гадоў была прыкавана да інваліднай каляскі. Пазней ёй было прысвоена званне «Заслужаны настаўнік СССР». О, дзіўная рукадзельніца, пявучая мастачка, мая дарагая мама!

І ў далейшым усе, амаль усе, хто сустракаўся на жыццёвым шляху, былі маімі строгімі, але вельмі добразычлівымі настаўнікамі. Першай, хто заўважыў мае літаратурныя здольнасці і агучыў на ўвесь клас маё школьнае сачыненне, была настаўніца Ларыса Барысаўна.

Замужам я была тройчы. Першы муж — вядомы мастак. Ад яго я збегла, не раздзяліўшы захапленне сюррэалізмам. Юнацкі максімалізм... Другі муж — ваенны лётчык, з-за якога я і апынулася ў Беларусі, мужны і выдатны чалавек, загінуў амаль 40 гадоў таму…

Трэці муж, Уладзімір — маё першае сапраўднае каханне. З ім мы пражылі 37 гадоў, выгадавалі дзяцей, пабудавалі дом, пасадзілі сад, выдалі больш за 25 маіх кніг! Так бывае, што першае каханне сустракаецца калі пражываем палову жыцця, як у Бэлы Ахмадулінай, памятаеце: «Хочаце верце, хочаце не верце. Было каханне другое і трэцяе… А першае я не адразу сустрэла… З таго часу толькі свята ў яго і веру. У сваё адзінае каханне — першае…»

Але яго таксама не стала чатыры гады таму… Ён у першыя дні аварыі на ЧАЭС быў у ліку ліквідатараў. Вынікі праявіліся праз трыццаць гадоў. Уладзімір — майстар спорту, дужы і моцны чалавек, жыццярадасны, згарэў ад злой і жорсткай хваробы... Як выжыла — не ведаю. Толькі сям'я, паэзія і праца сярод людзей, маіх выдатных калег, выратавалі... Нізкі ім паклон за падтрымку, любоў, клопат, увагу.

У Віцебску ў маім станаўленні як кіраўніка навастворанай грамадскай арганізацыі — абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі — істотна дапамагалі старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Паўлавіч Андрэйчанка (цяпер старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь) і Аляксандр Мікалаевіч Косінец (цяпер памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь). Пра іх хочацца сказаць асабліва, як пра людзей выключных: працавітых, энергічных, адданых сваёй справе, якія ўмеюць разбірацца ў людзях, давяраць ім.

У літаратурным свеце — найвялікшая павага да нашага легендарнага пісьменніка і кіраўніка, народнага пісьменніка Беларусі Мікалая Чаргінца; да маіх расійскіх аўтарытэтных калег — былога старшыні Саюза пісьменнікаў Расіі Валерыя Ганічава, рэдактараў маіх першых кніг, літаратуразнаўцаў, кіраўнікоў вядомых расійскіх выдавецтваў і часопісаў Станіслава Куняева, Аляксандра Казінцава.

Словы ўдзячнасці адрасую Алесю Карлюкевічу, Уладзіміру Андрыевічу, пры падтрымцы якіх былі выдадзены некалькі маіх найлепшых кніг, у тым ліку і той, якая стала лаўрэатам Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі.

Вельмі знакавымі былі звароты да маёй творчасці літаратуразнаўцаў, якія зрабілі глыбокі аналіз маіх кніг, — акадэміка Уладзіміра Гніламёдава, прафесара Таццяны Шамякінай. Шэраг прафесійных артыкулаў напісалі вядомыя літаратуразнаўцы і калегі па пяры Алесь Марціновіч, Зіновій Прыгодзіч... Сяброўства падтрымліваю і цяпер з першымі рэдактарамі маіх кніг, выдадзеных у Беларусі, Анатолем Аўруціным, Нінай Чайкай, Віктарам Шніпам… Я ўдзячна ўсім, хто з адкрытай душой сустрэўся на маім шляху!

**— У чым для вас найвышэйшая каштоўнасць сям'і?**

— Сям'я — гэта і ёсць Радзіма. Дзе бацькі, дзяды, дзеці, унукі — там і вытокі патрыятызму, там — Айчына. Мае родныя — мая падтрымка ва ўсім, а я — іх апора, дарадца, настаўнік, выхавальнік. У пераемнасці пакаленняў — працяг жыцця, яго святло.

У мяне было трое дзяцей. Цяпер у гэтым свеце, са мной, — двое. Старэйшы сын Мікалай, вайсковец, будучы зусім малады, загінуў у службовай камандзіроўцы.

Уся мая вялікая радня, сваточкі, сваякі, усе — адна вялікая і дружная сям'я. Усе працавітыя, старанныя, вельмі добрыя. Кожны па-свойму таленавіты. Гасцінныя і хлебасольныя, яны ўмеюць працаваць і весяліцца, гараваць і радавацца, дапамагаць адзін аднаму і непадробна спачуваць і суперажываць. Словам, мы разам! І гэта галоўнае. Такой павінна быць сям'я ў маім разуменні.

## Пра творчасць

**— Кажуць, да паэта прыходзіць муза. А каго чакае паэтка?**

— «Паэтка» — слова не маё. Яно нейкае штучнае, памяншальнае, ненатуральнае. Я ўвогуле не люблю гендарных адрозненняў, якія падкрэсліваюцца ў адносінах да людзей, якую б прафесію яны ні мелі. Можна падумаць, што прыналежнасць да таго ці іншага полу вызначае здольнасці і талент чалавека, яго працавітасць і ўменне служыць сваёй справе з поўнай аддачай?

Паэт! І не мае значэння, жанчына гэта ці мужчына. Таму паэт, калі ён сапраўды такім з'яўляецца, не чакае нікога і нічога. Ён працуе. На жаль, часцей за ўсё зарабляе свой хлеб надзённы іншай справай. Піша паэт зусім не для грошай і не для літаратурных крытыкаў… Сядзіць за пісьмовым сталом глыбока за поўнач, калі нехта ўжо спіць, нехта працуе, дзесьці кахаюць, а дзесьці забіваюць... А ты, паэт, сядзіш, такі маленькі і самотны, і няма ў цябе ні ўлады, ні сродкаў… Але ты гарыш жаданнем выратаваць, захаваць свет, палепшыць жыццё людзей. І наўмысна не складаеш аніякіх слоў — яны просяцца самі, імкліва кладуцца на паперу, спяшаешся, каб не страціць, усё занатаваць.

**— Вядома ваша крылатая фраза: «Душа — геніяльная форма выратавання». Што гэта значыць для вас?**

— Гэта першы радок верша, напісаны шмат гадоў таму і прысвечаны майму мужу Уладзіміру: «Душа — геніяльная форма выратавання». Для мяне гэта маё сакральнае бачанне. А для чытача? Гэта залежыць ад яго думкі, бачання. Галоўнае, куды прывядуць яго гэтыя словы, што дадуць: асацыяцыі, дапамогу. Так, менавіта дапамогу. Бо ўсё, што я раблю, пішу, кажу, служыць толькі аднаму: дапамагчы іншаму. Паэту вельмі ўласціва на сваёй шкуры адчуваць спаўна гэтыя пакуты. Дык каму ж, як не яму, шчыраваць для іншых?! Верагодна, часам адным радком. І, мне здаецца, гэта — нямала!

**— Тамара Іванаўна, вы — аўтар рознабакаовы. Як расстаўляеце прыярытэты ў творчасці для дарослых і дзяцей?**

— Ды не я іх расстаўляю. Яны мяне падпарадкоўваюць. Дзе, калі і пра што пісаць, вырашае толькі само жыццё. Прычым так лоўка раздае мне заданні, што аніяк ні аб'ехаць іх, ні абысці. Пасля выкананай задачы даецца новы загад: рухацца далей!

## Пра сябе

**— Як ставіцеся да даты свайго нараджэння: 1 красавіка?**

— Выключна з павагай і любоўю! Гэта дзень іконы Божай Маці "Замілаванне", дзень памяці Праведнай Сафіі, княгіні Слуцкай. І, галоўнае, дзень гэты і час майго нараджэння былі прадказаны маці маёй Мікалаем Цудатворцам у сне. І нарадзілася я ў зямлянцы, у глухой пасляваеннай вёсцы, дзе не было святла, дзе «Збан стаяў на краёчку стала… І ў ім свяціліся вербы, як мімозы…»

**— Ці пагодзіцеся, што ў вас мала вершаў пра каханне?**

— Усе мае вершы, абсалютна ўсе — пра каханне! Але пра каханне без стогнаў, галашэнняў, без ныцця і жаночых папрокаў. Гэта сапраўды мне не ўласціва. У маіх вершах — неспасціжна глыбокая любоў да ўсяго жывога, да людзей, родных і такіх безабаронных.

А пра каханне да канкрэтнага мужчыны... Не, ніколі я не магла сваё душэўнае гарэнне і палыханне адкрыць нікому. Нікому! Нават сабе. Гэта ўсё ўва мне. «Я не пісала пра каханне… Я ў ім жыла…»

**— Што для вас адпачынак?**

— Адпачываць не ўмею. І прызнаюся, што адпачынак — гэта мастацтва, мне зусім невядомае. Скажу, што найлепшыя моманты адпачынку для мяне — гэта праца. Бо толькі ў руху жыву, радуюся, адчуваю прыліў энергіі і сіл. У выкананні чагосьці важнага, карыснага, патрэбнага людзям, сям'і, дзецям, свету адчуваю сваю патрэбу. А інакш навошта? Навошта рабіць тое, што не патрэбна нікому?

**Падрыхтавала Алена СТЭЛЬМАХ**

# Кніжная дыпламатыя

**Працягваецца распачатая ў «ЛіМе» 10 сакавіка гаворка пра мастацкі пераклад. Вашай увазе прапануюцца вытрымкі з абмеркавання, агучаныя цікавыя факты з гісторыі і сучаснай перакладчыцкай практыкі, найбольш важныя думкі, выказаныя ўдзельнікамі акадэмічнага круглага стала «Мастацкі пераклад ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму: праблемы і перспектывы», у якім узялі ўдзел навукоўцы і пісьменнікі-перакладчыкі: дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Ігар Капылоў; першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі, пісьменніца-перакладчыца Алена Стэльмах; пісьменніца-перакладчыца Іна Фралова; перакладазнаўцы Алена Лапцёнак, Наталля Якавенка і мовазнаўца Ірына Ялынцава, што працуюць у Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі; перакладазнаўца, супрацоўніца Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі Інга Бязлепкіна; вядомы беларускі перакладчык і перакладазнаўца Міхась Кенька.**

«Навошта перакладаць Конан Дойла на беларускую мову, калі кожны з нас, сучасных беларусаў, здольны прачытаць Шэрлака Холмса па-руску, і прачыталі ўжо?» — са здзіўленнем запытала аднойчы таленавітая і вельмі паважаная ў літаратурных колах асоба падчас гаворкі па перакладазнаўчых тэмы.

*Пытанне «Навошта перакладаць?» наўрад ці ўзнікне ў расійскага чытача, калі размова будзе ісці пра пераклад з беларускай, англійскай ці любой іншай мовы на рускую, бо зразумела, што гэта неабходна для азнаямлення з іншамоўным творам. Аднак у Беларусі зусім іншая сітуацыя.*

**Міхась Кенька:** «Беларускі чытач здавён жывіцца перакладамі сусветнай літаратуры на рускую мову. На ёй былі выдадзены шматтомныя зборы твораў: Ч. Дыкенса ў 30 тамах, А. Бальзака ў 24 тамах, В. Скота выдалі 20 тамоў, Ф. Стэндаля — 15, Д. Лондана — 13, Ж. Верна і М. Твэна — 12, Г. Гейнэ і В. Гётэ — 10, Ф. Шылера — 7, згаданага А. Конан Дойла — 8, усіх не злічыць. Такую раскошу беларускія кнігавыдаўцы і перакладчыкі і раней не маглі і цяпер не могуць сабе дазволіць. Але беларускія чытачы без перашкод знаёміцца з творамі гэтых і многіх іншых замежных пісьменнікаў, таму што, набываючы сярэднюю адукацыю, добра авалодваюць рускай мовай, карыстаюцца ёй у быце.

Я некалі пераклаў на беларускую мову раман Генрыка Сянкевіча «Крыжакі». Аддаў на гэта шмат сіл і часу, але ніякага задавальнення не адчуў, бо мой пераклад аказаўся незапатрабаваны: ён быў яшчэ раней перакладзены на рускую мову. Цяпер імкнуся перакладаць тое, што на рускай мове не друкавалася».



Іна Фралова і Міхась Кенька.

*Ці значыць гэта, што англа-беларускі або нейкі іншы пераклад на беларускую пры наяўнасці рускамоўнага адпаведніка нам не патрэбны? Не, патрэбны, нягледзячы на нізкую запатрабаванасць і зразумелы прагматызм у стаўленні да такога перакладу ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму (двухмоўя). На тое ёсць шэраг сур'ёзных прычын.*

**Ігар Капылоў:** «Па-першае, мастацкі пераклад на беларускую мову — ***вельмі эфектыўны, дзейсны сродак папулярызацыі беларускай мовы***: далучэнне чытача да скарбаў сусветнай літаратуры праз беларускае слова. У сваю чаргу пераклад твораў беларускіх аўтараў на іншыя мовы не толькі садзейнічае знаёмству замежных чытачоў з набыткамі



Ігар Капылоў.

беларускіх творцаў, але і ***спрыяе ўключэнню беларускай мовы ў міжмоўны кантэнт***.

Па-другое, у сённяшні складаны час, калі адбываюцца палітычныя разломы, рэлігійныя спрэчкі, міжэтнічныя канфлікты, мастацкі пераклад адыгрывае выключна важную ролю ў якасці сродку міжкультурнай камунікацыі. Праз мастацкае слова ***фарміруецца так званая кніжная дыпламатыя, якая садзейнічае ўмацаванню міжнародных сувязей і кантактаў***».

***І чытач нярэдка выйграе пры азнаямленні з рознамоўнымі або з некалькімі аднамоўнымі перакладамі твора, таму што атрымлівае магчымасць лепшага разумення арыгінала.***

Вось, напрыклад, адным з папулярных у беларускіх кнігалюбаў твораў з'яўляецца раман Джэрома Дэвіда Сэлінджэра «*The Catcher in the Rye*» ў рускамоўным перакладзе Рыты Райт-Кавалёвай мае назву «Над пропастью во ржи» (1960). Існуюць яшчэ два пераклады гэтага твора на рускую мову: «Обрыв на краю ржаного поля детства» (1998) Сяргея Махрова і «Ловец на хлебном поле» (2008) Максіма Нямцова. У перакладах на іншыя мовы назва твора гучыць так: па-французску — «Лавец сэрцаў» («*L'attrape-coeurs*»); па-шведску — «Выратавальнік у крызісе» («*Räddaren i nöden*»); па-дацку — «Праклятае юнацтва» («*Forbandede Ungdom*»). І, нарэшце, па-беларуску — «Лавец у жыце» («Звязда», 2011, № 7, 3 верасня) або «Над прорвай у жыце» (паводле рускамоўнага перакладу 1960 года). Колькі розных сэнсаў, а значыць, і розных адкрыццяў у межах аднаго твора!

**Інга Бязлепкіна:** «У кантэксце блізкароднаснага беларуска-рускага білінгвізму і ў сувязі з двума толькі што згаданымі беларускамоўнымі варыянтамі назвы рамана Сэлінджэра неабходна сказаць таксама аб распаўсюджанай практыцы апасродкаванага перакладу праз рускую мову.

Часам пераклад, напрыклад, англамоўнай паэзіі праз рускамоўныя аналагі практыкуецца нават тымі, хто на прафесійным узроўні валодае замежнай мовай. Каб зразумець што з гэтага вынікае, давайце звернем увагу на заключныя радкі 8-га санета У. Шэкспіра.

Арыгінал: *"Whose speechless song, being many, seeming one // Sings this to thee: Thou single wilt prove none"*.

Пераклад С. Маршака: "Нам говорит согласье струн в концерте, // Что одинокий путь подобен смерти".

Пераклад М. Дуброўскага: "Таворадь гукі людзям у канцэрце, // Што адзінокі шлях цяжэй ад смерці".

Пераклад Я. Семяжона: "І сэнс бясслоўнай песні ў іх канцэрце, // Што адзінокі шлях падобны смерці".

Пры супастаўленні трох перакладных варыянтаў можна заўважыць іх падабенства паміж сабой: аднолькавая рыфма, увядзенне вобразаў канцэрта і струн, з'яўленне матыву шляху, параўнанне



Інга Бязлепкіна.

са смерцю, чаго няма ў арыгінале. У такіх выпадках добра было б ***мець яшчэ адзін адпаведны аўтарскаму тэксту, а не рускамоўнаму варыянту, пераклад на беларускую мову, што таксама з'яўляецца адказам на пытанне "Навошта перакладаць?"***».

**Ірына Ялынцава:** «Ва ўмовах білінгвізму (г. зн. валоданне і пераменнае карыстанне дзвюма мовамі) або полілінгвізму (калі ва ўжытку знаходзяцца тры і больш моў) узровень чытацкіх патрабаванняў да перакладчыцкай працы значна павышаецца. Чытачы, якія валодаюць не адной мовай, сапраўды могуць параўноўваць не толькі арыгінал і пераклад, але і некалькі перакладаў аднаго твора, што прымушае шукаць і выпрабоўваць розныя падыходы да самога працэсу перакладу, асабліва калі гэта руска-беларускі ці беларуска-рускі пераклад».

*У сувязі з двухмоўем чытачоў перад айчыннымі перакладазнаўцамі вострa стаіць яшчэ адно заканамернае пытанне: навошта перакладаць на беларускую мову творы рускай літаратуры, асабліва тыя, што вывучаюцца ў беларускіх школах?*

**Міхась Кенька:** «Добрае веданне рускай мовы ўсім адукаваным насельніцтвам Беларусі абумовіла тое, што пераклад на беларускую мову з рускай даўно ўжо практычна не патрэбны. Кнігі рускіх пісьменнікаў беларусы чыталі і чытаюць у арыгіналах, перакладаць якія ў такой моўнай сітуацыі няма патрэбы. Навошта чытаць А. Пушкіна, І. Буніна, Ф. Дастаеўскага, Л. Талстога ў перакладах, калі можна добра зразумець іх у арыгінале?».

**Алена Лапцёнак:** «Я хацела б выказацца наконт мэтазгоднасці руска-беларускага перакладу ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму. Мне імпануе думка, што пашырэнне перакладаў на беларускую — спосаб папулярызацыі беларускай мовы і ўмацавання яе пазіцый у свеце. Менавіта гэтая мэта абумовіла ўзнікненне значнай колькасці перакладных твораў у 20—30 гадах XX стагоддзя і заклала асновы айчыннай традыцыі мастацкага перакладу. Нашы класікі — Якуб Колас, Янка Купала, Янка Маўр — шмат перакладалі, прычым не толькі з рускай, але і з заходнееўрапейскіх моў — праз рускую. Тое самае адбываецца і цяпер».

Мэтазгоднасць перакладу з рускай на беларускую неадназначна ставілася пад сумненне не толькі чытачамі-білінгвамі, перакладчыкамі, але і некаторымі айчыннымі літаратуразнаўцамі (у прыватнасці, аўтарытэтным кампаратывістам Галінай Адамовіч). Тым не менш, паколькі любая нацыянальная культура, і літаратура як яе частка, цікавая свету ў першую чаргу сваёй класічнай спадчынай, то і па сённяшні актыўна перакладаецца на беларускую мову руская класіка. Напрыклад, наш выдатны празаік Алесь Жук пераклаў на беларускую раман «Майстар і Маргарыта» Міхаіла Булгакава, а на пытанне пра мэту і прычыну перастварэння адказаў: «Мне спадабаўся твор, і ўзнікла жаданне яго перакласці. Кожная развітая літаратура павінна мець пераклады твораў такога ўзроўню на роднай мове».

***Наяўнасць перакладаў на сваю нацыянальную мову твораў «вышэйшага гатунку» з далёкіх і блізкародных моў, як у нас руская, насамрэч з'яўляецца сведчаннем развітасці літаратуры.***

Высокая запатрабаванасць руска-беларускага мастацкага перакладу падаецца парадаксальнай, але яна заканамерная таму, што існуе жаданне пісьменнікаў-перакладчыкаў папрактыкавацца ў перакладчыцкім майстэрстве, якое патрабуе высокага ўзроўню валодання мовамі арыгінала і перакладу, чаму вельмі спрыяе наш беларуска-рускі білінгвізм.

**Алена Стэльмах:** «Сапраўды так. ***Пераклад — важны сродак для рэалізацыі творчага патэнцыялу пісьменніка***, таму што перакладчыцкая праца — гэта перш за ўсё ўдумлівае прачытанне твора. Зразумела, найлепшыя памочнікі на гэты час — слоўнікі, даведнікі, сябры-калегі, парады якіх не зашкодзяць. Усё гэта разам са свабодным валоданнем мовай арыгінала ў выпадку беларуска-рускага ці руска-беларускага перакладу спрыяе ўдасканаленню пісьменніцкага майстэрства».

**Іна Фралова:** «А наогул, што такое пераклад? Гэта не толькі кампраміс паміж кагнітыўным і эмацыянальным, гэта «скрынінг» нашага сучаснага грамадства. Арыгінал у параўнанні з перакладам, нават з самым таленавітым, жыве значна больш, некаторыя асобныя творы будуць жыць вечна. Праходзіць час, і пры ўмове, што грамадства дарастае, даспявае ўжо да іншага разумення тэксту, узнікае патрэба ў новых перакладах».

Безумоўна, пераклад — «скрынінг» свайго часу, як любы мастацкі твор, і менавіта таму, што выконвае функцыю арыгінала ў іншамоўнай культурнай і літаратурнай прасторы. Пры ўмове таленавітасці пераклад жыве, як арыгінал: «Над пропастью во ржи» з 1960 года чытаюць і будуць далей чытаць, нягледзячы на існаванне яшчэ двух рускамоўных перакладаў пазнейшага часу, якія засталіся незапатрабаванымі. А вось пра «іншае разуменне тэксту», да якога дарасло на сёння наша грамадства, варта пагаварыць наступны раз.

*Заканчэнне будзе.*

**Падрыхтавала Наталля ЯКАВЕНКА**

**Фота Марыны ВАРАБЕЙ**

# Годнасць «Глебаўкі»

**На выстаўку «Глеба», арганізаваную Мінскім дзяржаўным мастацкім каледжам імя А. К. Глебава, запрашае Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў. Экспазіцыя, якая размясцілася ў некалькіх залах будынка на Някрасава, 3, прымеркавана да 115-годдзя з дня нараджэння народнага мастака і з'яўляецца завяршальным праектам з шэрагу юбілейных, прысвечаных 75-годдзю навучальнай установы. Убачыць работы можна да 30 красавіка.**

Летась Мінскі дзяржаўны мастацкі каледж імя А. К. Глебава святкаваў свой юбілей. Сярод знакавых падзей, якія адбыліся ў яго межах, — канферэнцыя з удзелам дэлегацыі Санкт-Пецярбургскай акадэміі мастацтваў імя Ільі Рэпіна, выстаўка яе выпускнікоў у Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага. Амаль год таму ўстановы адукацыі падпісалі дагавор аб супрацоўніцтве: мяркуецца правядзенне большай колькасці сумесных праектаў і майстар-класаў. Нагадаем, што на працягу года ў розных гарадах Беларусі праходзілі выстаўкі, прысвечаныя юбілею МДМК імя А. К. Глебава. Што тычыцца сталіцы, то ў Нацыянальным мастацкім музеі працавала выстаўка работ выпускнікоў розных гадоў «Ступені майстэрства», на гэтай жа пляцоўцы ўрачыста ўручалі дыпломы і адкрылі экспазіцыю найлепшых работ выпускнікоў, у Мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» прадставілі сучасны праект «Графіка. Плакат», у Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага прэзентавалася экспазіцыя выкладчыкаў каледжа «Структура майстэрства»… Адбыўся, між іншым, і юбілейны канцэрт да 75-годдзя Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А. К. Глебава ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

І вось — кропка ў святкаванні. Выстаўка «Глеба» прадстаўляе жывапісныя, скульптурныя работы, арт-аб'екты і інсталяцыі, створаныя адмыслова для праекта навучэнцамі і выкладчыкамі каледжа ў 2022—2023 гг. Павіншавалі маладых аўтараў, настаўнікаў і кіраўніцтва каледжа ў асобе Аляксандра Шантаровіча старшыня Беларускага саюза мастакоў Глеб Отчык, дырэктар Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Сяргей Крыштаповіч, сваякі Аляксея Канстанцінавіча Глебава і многія іншыя.


Максім Зубра «Вартаўнік», 2022 г.

Як падкрэсліваюць арганізатары, назва выстаўкі ўключае некалькі аспектаў паняцця «глеба». Глебу разглядаюць як верхні ўрадлівы пласт зямлі (знакі зямлі, персефанічны міф, археалогія культуры, краявіды і г. д.). Звяртаюцца мастакі і стваральнік выстаўкі да азначэння «культурная глеба»: гэта аснова, падмурак, на якім трымаецца тая ці іншая мастацкая школа. Між тым вядома, што «глебаўкай», «глебай» навучэнцы, выпускнікі і выкладчыкі называюць родны каледж, ці вучылішча, як многія звыклі згадваць. Дарэчы, установа адукацыі носіць імя выбітнага беларускага скульптара з 1969 года. «Мінскі мастацкі каледж — гэта своеасаблівы культурны феномен другой паловы XX — пачатку XXI стагоддзяў. Ён прайшоў цікавы шлях станаўлення, пошукаў і развіцця. Як у любой навучальнай установы, у яго былі ўзлёты і падзенні, але вопыт, назапашаны многімі пакаленнямі выкладчыкаў і вучняў, стаў надзейным падмуркам для далейшага развіцця, здольным вытрымаць на сваім шляху любыя стыхіі, — падкрэсліваюць арганізатары і дадаюць: — Галоўнай вартасцю "Глебаўкі" заўсёды былі захаванне найлепшых традыцый, спалучэнне высокага выканальніцкага майстэрства з вынікамі творчага эксперыменту».


Арцём Трацякновіч «Што засталося», 2022 г.

Выстаўка ў НЦСМ дае магчымасць убачыць самае актуальнае ў творчых пошуках маладога пакалення, вылучыць перспектыўнае і абнадзейлівае для тых, хто, цалкам верагодна, будзе ацэньваць работы ў недалёкай будучыні, калі аўтары захочуць стаць навучэнцамі той жа Акадэміі мастацтваў. Так ці інакш, аналізаваць і ацэньваць ёсць што: ад самага пачатку знаёмства з экспазіцыяй «Глеба» ўзнікае адчуванне, што асэнсаваць творы даволі складана: занадта розныя шляхі выбіраюць маладыя жывапісцы, скульптары і дызайнеры, вельмі непадобны іх светапогляд, ды і ўплыў (у нечым тая самая глеба) на творцаў, відавочна, адрозніваецца.

Цікава, да якіх тэм звяртаюцца і будуць звяртацца такія розныя — нават знешне — мастакі, як паўплываюць на непаўторлівы мастацкі працэс краіны і ці змогуць, і, галоўнае, ці захочуць гэта рабіць… Роздумы «ў нікуды»: як шмат гісторый аб непрызнанасці ці, наадварот, пераацэненасці мы помнім і (тут самае неверагоднае) яшчэ даведаемся.

У чатырох залах НЦСМ на Някрасава размясцілася, умоўна, некалькі праектаў. Так, у адной прасторы пераважаюць яркія і насычаныя інсталяцыі, прысвечаныя тэме святла і колеру. Стварае ў гэтым кірунку Александрына Ерышава («Геаметрычныя гульні», 2022—2023; «Праявы святла», 2022—2023), якая натхняе навучэнцаў на падобныя эксперыменты: прадстаўлены калаж «Habitat (= "Асяроддзе прабывання")». Адлюстраваны, відавочна, самі аўтары, якіх ажно дзевяць: Ульяна Венгура, Ірына Геваркова, Мар'я Глушко, Варвара Журовіч, Любава Лёля, Васілій Сыты, Паліна Табурава, Паліна Токарава і Дзіяна Шаркова. Канцэптуальная работа дэманструе запал, азарт, смеласць і свабоду мастака, якія яшчэ не прыгнечаны цяжарам бясконцых ведаў і атрымлівае радасць, сапраўднае задавальненне і ад прадчування творчасці, і ад працэсу. Гэта тая самая энергія маладосці, што даецца адносна нанадоўга, але часта застаецца ўяўленнем ідэалу, утопіяй на ўсё жыццё.

Інсталяцыя «Пахаванне стралы. Трансфармацыя» (2023) — адна з ключавых частак выстаўкі. Аўтары своеасаблівага праекта Марыя Дарошка, Аліна Кулінковіч, Вікторыя Лінкевіч, Яўгенія Новік, Ганна Калініна, Лізавета Мароз, Аляксандр Галкін і Алена Белазаровіч пераасэнсоўваюць знакаміты старажытны народны абрад: праводзіцца (а ў некаторых мясцінах Гомельшчыны традыцыя яшчэ захавалася), каб надаць зямлі ўрадлівасць. Дарэчы, хавалі не толькі лялькі, як мяркуюць многія, але і грошы ці металічныя прадметы. Гэтыя аспекты і ўлічылі маладыя мастакі — у сваіх творах выкарысталі такія матэрыялы, як дрэва, грунт, жыта, тканіна, метал і іншыя. Звярнуліся яны да самых розных вобразаў і сімвалаў, у якіх выяўляецца жыццё чалавека і прадметны свет. Прытым самі кампазіцыі вельмі адрозніваюцца паміж сабой, маюць асаблівы падтэкст.

У трэцяй зале яшчэ болей адкрыта і проста ідзе гаворка аб урадлівасці глебы. Напрыклад, жывапісныя работы «Рунь» (2023) і «Пачатак» (2023) зноў-такі аўтарскага калектыву, у які ўвайшлі Марыя Дарошка, Аліна Кулінковіч, Вікторыя Лінкевіч, Ганна Калініна, Лізавета Мароз і Аляксандр Галкін. Іграе ролю ўсё тая ж шматзначнасць пэўных паняццяў, акцэнтуецца ўвага на вечных матывах у мастацтве. Тычыцца гэта і старажытнай міфалогіі і біблейскіх гісторый, да якіх звяртаюцца аўтары. Так, палатно «Дыяніс» (2022) Аляксандра Галкіна ўдала раскрывае дваістую прыроду бажаства. Зразумела, што Дыяніс асацыіруецца з урадлівасцю і багаццем, з энергіяй і любоўю да жыцця. У той жа час гэта хтанічнае і крывавжэрнае бажаство, для якога не скупіліся на ахвярапрынашэнні. Гэтая тэма даволі ўдала ўпісалася ў канцэпцыю праекта.

Якімі бы ні былі аўтарскі пачатак і ўнікальнасць задумы, выстаўка «Глеба», асабліва яе чацвёртая зала, паказвае плён сумесный работы людзей, якія вучацца ў адных і тых жа настаўнікаў (яркі прыклад — «Раўнадзенства» ад розных аўтараў). Хоць калектыўны твор тут толькі адзін — маштабная кампазіцыя «Глеба — Ū» (2022), нават адрознасць кірунку думак, асабістая работа з матэрыялам, удасканаленне стылю кожнага з аўтараў гавораць пра шмат у чым агульны шлях і вялікія намаганні ўсіх, хто задзейнічаны ў творчым і адукацыйным працэсе.


Падчас адкрыцця.

**Яўгенія ШЫЦЬКА, фота аўтара**


Лізавета Мароз «Два стагоддзі (Аўтапартрэт)», 2022 г.


Яўгенія Новік «Раўнадзенства», 2022 г.


Аліна Кулінковіч «Аўтапартрэт з птушкай», 2022 г.

# Фарбы вясны

**Гэтымі сапраўды зімовымі днямі завяршае сваю работу вясенняя выстаўка жывапісу «Суквецце». Тэматычную экспазіцыю ў кінатэатры «Цэнтральны» можна ўбачыць да 3 красавіка. Куратарам выступае мастачка і дызайнер Юлія Коба.**



*Віктар Данілаў «Чырвоны бэз. Свята», 2023 г.*

Для выстаўкі «Суквецце» свае работы прадставілі Анастасія Балыш, Дзіяна Горбач, Ала Кейге, Віктар Данілаў, Наталля Жураўская, Людміла Зыгмантовіч, Дзмітрый Кузьміч, Ала Кушнер, Аляксей Лаціннік, Георгій Міхейчык, Юлія Навейка, Сяргей Цігараў, Ларыса Шахновіч, Леанід Ячнеў і сама куратар Юлія Коба. 30 палотнаў ад 15 аўтараў. Іх творы шмат у чым падобныя і аб'яднаны агульнай тэматыкай: прыгажосці і любові. Мастакі, многія з якіх, думаецца, не знаёмы шырокаму гледачу, імкнуцца перадаць асабістую радасць ад абуджэння прыроды і, галоўнае, ад прыгажосці цвіцення.

Пераважную частку экспазіцыі склалі пейзажы і нацюрморты, у цэнтры ўвагі — хараство вясенняй прыроды. Простыя сюжэты адлюстроўваюць моманты існавання, якія большасці падаюцца самымі чароўнымі і каштоўнымі: золак, калі сонца яшчэ толькі ўгадваецца («Майскае світанне» Леаніда Ячнева), і ранішняя зорка, якая падымаецца над гарызонтам («Рамонкавая далячынь» (2022) Юліі Кобы); яркі поўдзень, які азарае святлом так, што нават хочацца схавацца ў цень («Дзьмухаўцовы цвет» (2021) Дзмітрыя Кузьміча), і густы змрок вечара, у якім патанае ўсё вакол («Туман у гарах» (2022) Дзіяны Горбач)… На жаль, мала хто ў сучасным жывапісе валодае майстэрствам адлюстравання вясновага вечара — гэта непаўторны час, які валодае выключнай энергетыкай і патрабуе асаблівага спосабу адлюстравання. Тут бясспрэчным аўтарытэтам, калі казаць пра айчыннае мастацтва, выступае Вітольд Бялыніцкі-Біруля, якому няма роўных.

Падобныя развагі актуальныя і ў рэчышчы нацюрморта: стварыць варты ўвагі твор гэтага жанру — справа нялёгкая, а для многіх увогуле абсалютна марная. Аднак калі казаць пра імкненне паказаць дары прыроды, выкарыстоўваючы традыцыйныя сродкі, без нацюрморта не абысціся. Толькі якія з іх можна сёння назваць належнымі і своечасовымі? Якім чынам ствараць, каб не адпудзіць гледача? Чым яго зацікавіць і якім чынам запомніцца? Пра гэта сёння могуць расказаць паспяховыя жывапісцы, напрыклад, Алеся Скорабагатая і Аляксандр Даманаў. Пра нацюрморты выстаўкі «Суквецце» няправільна разважаць звыклымі катэгорыямі — усё ж гэта не ўзровень рэспубліканскай выстаўкі, да твораў якой журы выстаўляла б канкрэтныя патрабаванні. У экспазіцыі — мілавідныя работы, што адпавядаюць яе задуме. Найбольш прыкметныя: «Чырвоны бэз. Свята» (2023) Віктара Данілава, «Макі» Алы Кейге, «Півоні» (2008) Алы Кушнер, «Фарбы вясны» (2018) Аляксея Лацінніка, «Нацюрморт з флоксамі» (2021) Юліі Кобы.



*Анастасія Балыш «Аматарка Дэвіда Осціна», 2020 г.*



*Ала Кейге «Макі».*

У асноўным на выстаўцы дэманструюцца рэалістычныя сюжэты, але сустракаюцца і абстрактныя. Здаецца, менавіта ў такіх работах занатавана не толькі прыгажосць, але і канкрэтная думка. Так, удалымі падаюцца развагі Аляксея Лацінніка — ён звяртаецца да знакамітых вобразаў сусветнай культуры і прадстаўляе ўласныя легкаважныя інтэрпрэтацыі. Нельга абысці ўвагай работы Анастасіі Балыш (мастачка стварае свет казкі, які нагадвае фантазіі папулярнай Ганны Сілівончык) і Дзіяны Горбач, творы якой добра ўпісваюцца ў традыцыю айчыннай акварэльнай школы.

***Аднак калі казаць пра імкненне паказаць дары прыроды, выкарыстоўваючы традыцыйныя сродкі, без нацюрморта не абысціся. Толькі якія з іх можна сёння назваць належнымі і своечасовымі? Якім чынам ствараць, каб не адпудзіць гледача? Чым яго зацікавіць і якім чынам запомніцца? Пра гэта сёння могуць расказаць паспяховыя жывапісцы, напрыклад, Алеся Скорабагатая і Аляксандр Даманаў. Пра нацюрморты выстаўкі «Суквецце» няправільна разважаць звыклымі катэгорыямі — усё ж гэта не ўзровень рэспубліканскай выстаўкі, да твораў якой журы выстаўляла б канкрэтныя патрабаванні.***

**Яўгенія ШЫЦЬКА**

# Паклон беларускаму краю

**Пакуль яшчэ нясмелае сонца прабіваецца праз шкляны купал выставачнай залы, асвятляе сцяну, на якой вывешаны карціны. Такое ж сонечнае святло — і на палотнах, дзе пазнаюцца знаёмыя многім краявіды. І — агульная атмасфера замілавання родным краем. Выстаўка мастака Андрэя Лычкоўскага сабрала прыхільнікаў яго творчасці ў Палацы культуры горада Узда.**

Арганізатары часовай экспазіцыі (а гэта супрацоўнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі імя П. Труса) паклапаціліся пра тое, каб як мага шырэй пазнаёміць наведвальнікаў з постаццю мастака. Ахвотныя гарталі газеты і часопісы з матэрыяламі пра творчасць Андрэя Лычкоўскага. А гэта выданні з Узды, суседніх раёнаў Мінскай вобласці, з Ліды і Мастоў, Мазыра і Гомеля, а таксама рэспубліканскія газеты і часопісы. Работы Андрэя Міхайлавіча займаюць пачэснае месца ў 32 музеях Беларусі. А гэта амаль кожны райцэнтр Мінскай вобласці, музей беларускага Палесся ў Пінску і дом-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку, мастацкая галерэя ў Полацку і Тураўскі краязнаўчы музей, гістарычны музей Крычава і раённы музейны комплекс імя Напалеона Орды ў Іванаўскім раёне…

Андрэй Лычкоўскі з'яўляецца не толькі ўдзельнікам, але і арганізатарам сумесных выставак мастакоў, пленэраў, якія праходзяць у розных гарадах і рэгіёнах Беларусі: Гродна, Бяроза, Пружаны, Івацэвічы, Слонім і іншыя. І ўсюды, дзе бывае, пакідае на памяць свае работы.

У выступленні перад землякамі Андрэй Міхайлавіч прызнаўся:

— Я ніколі не прадаваў свае карціны, нават у самыя цяжкія часіны. Сапраўдныя творы мастацтва павінны знаходзіцца не ў прыватных калекцыях, сямейных архівах, дзе іх змогуць пабачыць тры-пяць чалавек, а ў музейных экспазіцыях.

Але найбольш прыемна выстаўляць свае карціны перад землякамі. Яно і зразумела — пераважная большасць сюжэтаў для яго пейзажаў і нацюрмортаў узяты з наднёманскіх мясцін. Бацька Нёман паўстае перад намі ў вясновым разводдзі, летняй красе, восеньскай стракатасці фарбаў, а асабліва шмат карцін намалявана з зімовай натуры. Вось яна, прыгажосць роднага краю, перададзеная пэндзлем. Невыпадкова эпіграфам да выстаўкі абраны словы з верша народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча «Паклон табе, мой беларускі край!».

Павіншаваць мастака з адкрыццём экспазіцыі прыйшлі дзясяткі людзей з Уздзеншчыны і не толькі. Шаноўнымі гасцямі мерапрыемства сталі мастакі з Мінска. Цёплыя словы прызнання выказаў даўні сябар Андрэя Лычкоўскага, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Яўген Шунейка:



*Фрагмент адной з работ.*



*Андрэй Лычкоўскі (у першым радзе другі злева) з наведвальнікамі выстаўкі.*

— Мастак сцвердзіўся як выдатны творца на роднай зямлі. Жывучы сярод такой чыстай прыроды, ён навучыўся ў звычайным пейзажы заўважаць усё жывое, велічнае, аптымістычнае. Маючы ўласную адметную манеру пісьма, ён не застывае ў нейкім адным кірунку, а пастаянна ўдасканальваецца і заўсёды пазнаецца сярод калег па пэндзлі.

Дапоўніў свайго настаўніка яго малады калега, аспірант Акадэміі мастацтваў, госць з Кітая Іжан Юйнін:

— Я бачу на кожнай карціне энергію, якая надае мне сілы!

Ухвалілі майстэрства уздзенскага мастака і іншыя яго калегі — Фёдар Ладуцька і Алесь Філіповіч. Жадалі творцу новых поспехаў галоўны захавальнік фондаў Уздзенскага гісторыка-краязнаўчага музея Ірына Віяленцій, кіраўнік раённай аб'яднанай арганізацыі прафсаюзаў Аксана Салавей, іншыя прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі раёна.

**Віктар САБАЛЕЎСКІ, фота аўтара**

# Закуліссе адкрытага сэрца

**Сусветны дзень тэатра штогод адзначаецца 27 сакавіка. Свята даўно перастала быць проста прафесійным, яно аб'ядноўвае ўсіх, хто мае дачыненне да тэатральнага мастацтва. З гэтай нагоды публікуем размову з прэс-сакратаром Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Жаннай Гурынай аб праекце «ТэатраТэрапія», складаных спектаклях і людзях.**

**— На сайце РТБД побач з вашым іменем цэлы шэраг пасад: прэс-сакратар, кантэнт-менеджар, аўтар блога на сайце, аўтар і куратар творчай лабараторыі «ТэатраТэрапія». Як склаўся такі шырокі спіс пазіцый?**

— Гэта сапраўды так. У гэтым сезоне проста адкрыла, што я сапраўды маю шмат абавязкаў. Мне здаецца, што так і павінна быць, калі займаешся любімай справай. Таму што прыходзіць на працу і рабіць мінімум… Ну навошта? Калі можна працаваць добра, ствараць новыя праекты, якія будуць дапамагаць гледачам, дапамагаць нам таксама. Мне важна адчуваць каштоўнасць таго месца, у якім праходзіць значная частка майго жыцця.

Я ўжо шосты год у тэатры, калі не ўлічваць невялікі перапынак у нашых стасунках. Даведалася аб РТБД з універсітэцкай насценгазеты. Пачала глядзець сайт, сацсеткі, здзівілася. На ўзроўні каштоўнасцей, візуалу гэта так супадала з маімі поглядамі. Таму проста прыйшла ў тэатр і сказала, што хачу тут працаваць.

Кожную вольную хвіліну я імкнулася ў РТБД, каб у кагосьці ўзяць інтэрв'ю, атрымаць каментарый. Так пачала гутарыць з акцёрамі, афармляць у тэкст. Паступова вось такім чынам нарадзіўся «Блог».

У гэтым спісе няма аднай пасады. Пэўны час я працавала ў касе. Гэта асаблівы досвед, спецыфічны. Табе патрэбна не проста прадаць квіток, а параіць, распавесці, парэкамендаваць! А я і так люблю кожны наш спектакль. Аднойчы жанчына расплакалася ад майго аповеду і папрасіла абняцца. ТэатраТэрапія пачалася ўжо тады.

*Людзі, якія цяпер прыходзяць на «ТэатраТэрапію», — гэта тыя, хто хоча бачыць перад сабой чалавека. Не манекен, які не цэніць іх эмацыянальны досвед пасля прагляду спектакля, іх боль, страхі і пакуты. Яны імкнуцца да чалавека, які будзе іх бачыць, які прайшоў праз нейкія жыццёвыя цяжкасці. Вельмі важна трымаць сэрца адкрытым. Трэба мець вялікую смеласць, каб зазірнуць у сябе, убачыць сваю сапраўднасць. Усё гэта здараецца на «ТэатраТэрапіі». Часам адбываюцца нейкія дзівосныя рэчы.*

**— «ТэатраТэрапія» — гэта прастора, дзе чалавек сутыкаецца з сабой, што часам няпроста. Там патрэбен спецыяліст, здольны ўважліва да яго паставіцца. Які досвед і адукацыю ў псіхалагічнай галіне вы маеце?**

— Адразу адзначу, што я дагэтуль працягваю вучыцца. Мне хочацца развівацца і расці. Навучанне ў псіхалагічных кірунках не толькі дзеля ведаў і досведу, для мяне гэта такая валіза, куды я складаю ўсе набытыя ў працэсе скарбы. А пасля пры нагодзе штосьці з гэтай валізы дастаю і карыстаюся. Як фокуснік дастае з рукава стужачку.

Пачаўся мой досвед з трансфармацыйнага коўчынгу, таму што ў яго ўваходзяць самыя эфектыўныя інструменты з розных кірункаў. Я ўспамінаю той перыяд свайго жыцця, які прыпаў на вучобу, і ён выклікае цёплыя, трапяткія, пяшчотныя пачуцці. Мае першыя настаўнікі сталі для мяне прыкладам чалавечнасці ў тэрапіі і далёка за яе межамі.

Асаблівы для мяне вопыт вывучэння энеаграмы — гэта мадэль бессвядомых паводзін чалавека, якая апісвае дзевяць фундаментальных тыпаў асобы.



Фота з асабістага архіва Ж. Гурынай.

Жанна Гурына.

Вельмі добра гэтая мадэль тлумачыць узаемаадносіны паміж людзьмі, дапамагае таксама пазнаёміцца з сабой і ведаць, у якіх сферах жыцця развівацца, расці, з чым працаваць. Чаму нам з кімсьці камфортна, а хтосьці выклікае злосць ці раздражненне.

Пасля былі гештальт-тэрапія, экзістэнцыянальная псіхатэрапія і генератыўны гіпноз.

**— З чаго ўзнікала ідэя такой незвычайнай творчай лабараторыі? Гэта недзе было падгледжана альбо гаворка ідзе пра ўнікальны праект?**

— Такія праекты, як «ТэатраТэрапія», узнікаюць з унутранай падрыхтаванасці. І ў першую чаргу вельмі важны асабісты досвед групавой тэрапіі. Калі назапашваеца пэўны вопыт, то ўжо ведаеш, як абыходзіцца з тым ці іншым запытам. Заўсёды пад рукой валіза з інструментамі.

У кастрычніку 2022-га адбылася першая сустрэча. Я не хацела гледача кідаць адразу ў абсалютна новы фармат. Атрымаўся такі пераходны варыянт. Мы абмяркоўвалі спектакль, эмацыянальную рэакцыю ўдзельнікаў, і пэўнай апорай для гледачоў была артыстка Людміла Сідаркевіч. Тады на абмеркаванні было больш за дваццаць чалавек. Пазней вырашыла скараціць колькасць удзельнікаў.

Што тычыцца ўнікальнасці. Я не знайшла нічога падобнага. У нас у Беларусі такога дакладна ніхто не робіць. Магчыма, такі фармат існуе дзесьці за мяжой, але даведацца пра гэта складана. «ТэатраТэрапія» — гэта не феномен. Нельга сказаць, што вось Жанна Гурына прыдумала яе. Арт-тэрапія існуе сама па сабе як кірунак.

**— Хто туды можа патрапіць? Ці трэба праходзіць нейкі адбор?**

— Людзі, якія цяпер прыходзяць на «ТэатраТэрапію», — гэта тыя, хто хоча бачыць перад сабой чалавека. Не манекен, які не цэніць іх эмацыянальны досвед пасля прагляду спектакля, іх боль, страхі і пакуты. Яны імкнуцца да чалавека, які будзе іх бачыць, які прайшоў праз нейкія жыццёвыя цяжкасці.

Вельмі важна трымаць сэрца адкрытым. Трэба мець вялікую смеласць, каб зазірнуць у сябе, убачыць сваю сапраўднасць. Усё гэта здараецца на «ТэатраТэрапіі». Часам адбываюцца нейкія дзівосныя рэчы.

На сустрэчах я імкнуся стварыць бяспечную прастору. Таму калі чалавек браніруе месца і кажа: «Я хачу на ТэатраТэрапію!», то абавязкова праводжу гутарку. Група фарміруецца з пэўным эмацыянальным полем, і калі прыйдзе чалавек, каб проста паглядзець, то справа не пойдзе. Патрэбна не падрыхтоўка, а ўнутраная гатоўнасць.

**— З новага года ў фармаце «ТэатраТэрапіі» адбыліся змены. Як праходзяць сустрэчы ў межах лабараторыі цяпер?**

— Так, з новага года мы перайшлі да двухдзённага фармату. З самага пачатку было зразумела, што людзі прыносяць эмацыянальны фон з сабой. Калі чалавек перажывае развод, то ён нават у дзіцячым спектаклі ўбачыць гэты развод. Так і атрымліваецца: глядзяць камедыю і плачуць. Таму я пачала падводзіць удзельнікаў да новага фармату. Беражліва, амаль што незаўважна.

Паступова намецілася дынаміка, наладзіліся ўзаемаадносіны, людзі пачалі бачыць адно аднаго, а не толькі мяне. Справа пайшла! У снежні я агучыла, што з новага года ў нас «ТэатраТэрапія» два дні. Мне адказалі: «Ура!» — гэта пра патрэбу ўдзельнікаў і ўнутранай гатоўнасці ісці далей.

Перад кожнай сустрэчай ужо вядома тэма. Як працуе група? Мы збіраем «поле»: хто з чым прыйшоў, хто з чым хацеў бы сёння папрацаваць? Збіраецца пэўны групавы запыт, і мы з ім працуем. Тэрапія — гэта ў першую чаргу стасункі. «ТэатраТэрапія» — таксама.

Пасля прагляду ўдзельнікі ідуць дадому пераначаваць са сваімі ўражаннямі. А ўжо на наступны дзень абмяркоўваем спектакль. Некаторыя з гледачоў прызнаваліся: «Калі б не "ТэатраТэрапія", з гэтым спектаклем не справіўся б». Вось такія пастаноўкі ў РТБД: кожны раз даводзіцца працаваць, акцёрам — на сцэне, а гледачам — у зале.

Часта бывае, што ў мяне пытаюцца, а што ж хацеў сказаць аўтар. Адказ адзін: аўтар што хацеў, тое і сказаў. Галоўнае зараз — што ўбачыў глядач. Часам людзі просяць нешта перадаць акцёру альбо рэжысёру. Заўсёды перадаю!

**— Як вызначаецца тэма для сустрэчы? Ад чаго яна залежыць? Ад вашага жадання, дынамікі групы ці афішы РТБД?**

— Першы спектакль у гэтым годзе, які разглядалі на «ТэатраТэрапіі», — «Паляванне на сябе». Я прыйшла на рэпетыцыю пастаноўкі і пачула такі выраз: «Я маленькі хлопчык, мяне завуць Віця Зілаў». Вельмі часта фраза паўтараецца. Я стала думаць і разважаць. У спектаклі герой Віця Зілаў робіць шмат жудасных рэчаў. Мне шкада гэтага маленькага дарослага хлопчыка, які згубіў сувязь з унутраным дзіцём. Так узнікла тэма «Унутраныя дзеці параненых дарослых».

Потым лагічна, калі мы пагаварылі пра дзяцей, закрануць фігуры бацькоў, унутраныя вобразы бацькоў альбо тых, хто іх замяняў у дзяцінстве, таму мы кажам Бацькоўскія фігуры. А што ў нас пра іх? «Шлюб з ветрам»! Гісторыя ўзмоцнена беларускімі народнымі спевамі, метафарамі і сімваламі. Гэта яшчэ больш дадае глебы для працы.



Фота з сайта РТБД.

Сцэна са спектакля «Шлюб з ветрам».

**— Якое стаўленне да праекта ў кіраўніцтва тэатра і акцёраў?**

— Яны разумеюць, наколькі важная і каштоўная гэтая праца. Таму што сапраўды ёсць спектаклі і людзі, якія могуць не справіцца з убачаным. Эмоцыі сапраўдныя, але што з імі рабіць?! Як з імі абысціся? Зараз ёсць такая магчымасць. За што я вельмі ўдзячна тэатру.

**— Што чакае«ТэатраТэрапію» ў будучыні?**

— У сакавіку мы паглядзелі «Пачупкі», папрацавалі і абмеркавалі тэму «Работа з інтраектамі». У красавіку будзе анлайн-прагляд пастаноўкі «Бетон». Там мы закранём тэму цела і прыняцця сябе. А ў маі наведаем «Сірожу» і раскладзём галоўных герояў па тыпах энеаграмы. Планы ёсць, аднак і дынаміка ў групы ёсць — гэта больш каштоўна.

* * *

Я захапляюся смеласцю людзей, якія прыходзяць на «ТэатраТэрапію». Таму што, каб адважыцца на сустрэчу з самім сабой, патрэбна мець моц.

**Гутарыла Яна ЦЭГЛА**



# У Доме літаратара — рэдакцыя «Масквы»

**Па традыцыі на Мінскай міжнароднай кніжнай выставцы-кірмашы частымі гасцямі з'яўляюцца пісьменнікі Расіі. І здараецца, што яны болей працуюць на выставцы, расказваюць пра сваю творчасць чытачам, наведвальнікам, а вось стасункі паміж беларускімі і расійскімі калегамі адсутнічаюць.**



Сёлета шмат хто з пісьменнікаў, якія прыехалі з іншых краін, наведаў Саюз пісьменнікаў Беларусі, Дом літаратара, правялі перагаворы, гутаркі з калегамі. Так склалася ў адзін з выставачных дзён і сустрэча з калектывам рэдакцыі часопіса «Москва».

Перад беларускімі пісьменнікамі выступілі галоўны рэдактар часопіса «Москва» паэт і празаік Уладзіслаў Арцёмаў, намеснік галоўнага рэдактара часопіса паэт і празаік Міхаіл Папоў.

Часопіс даволі вядомы сярод перыядычных літаратурна-мастацкіх выданняў Расіі. Выпускаецца ў Маскве з 1957 года. Сярод дасягненняў выдання, пра гэта і гаварыў У. Арцёмаў, — публікацыя на рускай мове казкі Антуана дэ Сент-Экзюперы «Маленькі прынц» у перакладзе Норы Галь. У 1966 і 1967 гадах часопіс надрукаваў раман Міхаіла Булгакава «Майстар і Маргарыта». У 1989—1990 гг. упершыню пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі надрукавана «Гісторыя дзяржавы Расійскай» М. М. Карамзіна. У розныя дзесяцігоддзі галоўнымі рэдактарамі часопіса былі Мікалай Атараў, Яўгеній Папоўкін, Леанід Барадзін, Міхаіл Аляксееў, Уладзімір Крупін… З лютага 2012 года — Уладзіслаў Арцёмаў. Напрыканцы 1980-х гг. тыраж часопіса «Москва» даходзіў да 775 000 экзэмпляраў.

Размова ў мемарыяльнай зале Дома літаратара ішла ў асноўным пра тое, як фарміруецца партфель часопіса. У. Арцёмаў адзначыў, што даволі шмат дзе ездзіць. І не толькі па рэгіёнах Расіі, але і за яе межамі. У рэдакцыі імкнуцца сачыць і за развіццём сучаснай беларускай літаратуры. Найперш — той яе часткі, якая ствараецца на рускай мове. Галоўны рэдактар «Масквы» пацвердзіў, што з кіраўніцтвам Саюза пісьменнікаў Беларусі дасягнута дамоўленасць пра выпуск у 2023 годзе "беларускага нумара" часопіса. Мяркуецца, што фінансавую падтрымку акажа ў гэтым і беларускі бок, выкупіўшы частку тыражу для чытача ў Беларусі.

Выступіў на сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі і празаік Міхаіл Папоў. Дарэчы, і ён, і У. Арцёмаў цесна звязаны з Беларуссю. Уладзіслаў Віктаравіч нарадзіўся ў Бярэзінскім раёне, на Міншчыне. Правёў у Беларусі частку свайго дзяцінства, юнацтва. Вучыўся на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Міхаіл Папоў таксама ў дзяцінстве жыў у Беларусі. Закончыў Жыровіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум. Беларусі, падзеям на тэрыторыі Гродзеншчыны ў час Вялікай Айчыннай вайны прысвечаны яго раман «На кресах всходних». Кнігу, між іншым, можна набыць у кнігарнях дзяржаўнай сеткі кнігагандлю ААТ «Белкніга». Міхаіл Папоў расказаў і пра работу над раманам, і пра тую частку партфеля рукапісаў часопіса, якая складаецца з празаічных твораў, запрасіў беларускіх аўтараў да болей шырокага супрацоўніцтва з «Московой». Удзел у сустрэчы прымаў і вядомы расійскі пісьменнік Мікалай Чаркашын, кнігі якога, між іншым, выдаюцца і ў Беларусі.

Была выказана на сустрэчы і такая думка: часцей арганізоўваць сумесныя сустрэчы расійскіх і беларускіх пісьменнікаў з чытачамі — у бібліятэках і навучальных установах Мінска, іншых гарадоў Беларусі. Часам многія здабыткі сучаснай рускай літаратуры застаюцца па-за ўвагай беларускага чытача. Хацелася б такую сітуацыю выправіць. Зацікаўленасць у гэтым ёсць і ў беларускіх, і ў расійскіх літаратараў.




У найбліжэйшыя месяцы ў Доме літаратара запланаваны сустрэчы з іншымі пісьменнікамі з Расійскай Федэрацыі, паэтамі, празаікамі, якія працуюць у розных перыядычных літаратурна-мастацкіх выданнях.

**Мікола БЕРЛЕЖ**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА**

# Паэзія яднае краіны

**Дні літаратуры Узбекістана ў Беларусі, якія праходзілі ў рамках XXX Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, азнаменавалі сабой важны крок на шляху да паглыблення інтэграцыі братэрскіх народаў ды, самае галоўнае, праклалі мост паміж дзвюма літаратурнымі традыцыямі. Так, цэнтральнымі мерапрыемствамі гэтай міжкультурнай ініцыятывы па праве можна лічыць паэтычныя вечары ў гонар узбекскіх класікаў Гафура Гуляма і Алішэра Наваі. Удзельнікамі апошняга з іх, які прайшоў 23 сакавіка ў канцэртнай зале сталічнага Дома літаратара, сталі як узбекскія, так і беларускія пісьменнікі.**

Вядучымі імпрэзы выступілі першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Стэльмах і старшыня Мінскага гарадскога аддзялення СПБ Міхась Пазнякоў. Перад пачаткам канцэртнай праграмы з прывітальным словам да аўдыторыі звярнуўся старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч: «Прыемна бачыць столькі моладзі на сённяшнім свяце ўзбекскай паэзіі, прыемна бачыць і нашых дарагіх узбекскіх гасцей! У снежні 2022 года Саюзы пісьменнікаў Беларусі і Узбекістана падпісалі Мемарандум аб супрацоўніцтве — мемарандум аб нашай дружбе. Дні літаратуры Узбекістана ў Беларусі — першы крок да рэалізацыі пагаднення. Нізкі паклон старшыні Саюза пісьменнікаў Узбекістана Сіражыддзіну Саіду, нізкі паклон Рысалат Хайдаравай, якая адказвае ў Саюзе пісьменнікаў за міжнародныя сувязі, і вам, дарагія сябры, хто прыехаў з Узбекістана ў наш яшчэ не надта цёплы сакавік... Але ён пацяплеў з вашым прыездам!»



Затым на сцэну падняліся прадстаўнікі ўзбекскай дэлегацыі: выканаўчы дырэктар грамадскага фонду імя Алішэра Наваі, навазнаўца Алімджон Даўлатаў і паэт, перакладчык, галоўны спецыяліст аддзела па рабоце з абласнымі аддзяленнямі і творчымі саветамі Саюза пісьменнікаў Узбекістана Мікалай Ільін. Выступоўцы распавялі пра выключнае значэнне постаці Алішэра Наваі ў гісторыі як нацыянальнай узбекскай літаратуры, так і, шырэй, агульнасусветнай. «Хто такі Наваі? Я лічу, што Бог стварыў толькі аднаго сапраўднага паэта, але даў яму многа розных імён. У Англіі яго назвалі Шэкспірам, у Італіі — Аліг'еры, а ва Узбекістане — Алішэрам Наваі. Асвечаны геніяльнасцю, Наваі мог дабіцца поспеху ў любой галіне, але выбраў літаратуру», — падзяліўся меркаваннем Алімджон Даўлатаў.

Падчас мерапрыемства прысутныя мелі магчымасць паслухаць вершы ўсходняга класіка па-ўзбекску ў выкананні носьбітаў мовы, а таксама ў перакладзе на рускую і беларускую ад прафесійных дэкламатараў і нават саміх перакладчыкаў. Акрамя таго, наведвальнікам былі прапанаваны песенныя і танцавальныя нумары, тэатралізаваныя сцэнкі з удзелам узбекскіх і беларускіх студэнтаў, маладых творцаў. Прыемна разбавіў агульны тон імпрэзы цыркавы перфоманс Хаджымурата Адзілджанава. Фінальным акордам творчага вечара ў Доме літаратара стала выступленне ансамбля цымбалістаў «Музыкі» дзіцячай музычнай школы № 10 імя Я. Глебава.

**Каміла НАВІНКІНА**
**Фота Васіля КУЛІКОВА**

# Чароўны Узбекістан

**У Тэатры паэзіі пры Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы ў Мінску адбыўся вечар узбекскай паэзіі, прысвечаны 120-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Узбекістана Гафура Гуляма. Гэта было адно з многіх мерапрыемстваў у межах Дзён літаратуры Узбекістана ў Беларусі.**

Шмат добрых слоў пра класічную і сучасную ўзбекскую літаратуру і супрацоўніцтва творчых саюзаў дзвюх краін сказаў вядучы імпрэзы старшыня Мінскага гарадскога аддзялення СПБ Міхась Пазнякоў. Ад дэлегацыі ўзбекскіх літаратараў выступілі паэты і перакладчыкі Салім Ашур, Сіражыддзін Рауф і Мікалай Ільін. Перакладчыкі ўзбекскай паэзіі на беларускую мову Міхась Пазнякоў і Іна Фралова прачыталі свае пераклады твораў Гафура Гуляма і сучасных узбекскіх паэтаў. На рускай мове вершы Гафура Гуляма прагучалі ў выкананні артысткі эстрады, тэатра і кіно Вольгі Багушынскай і паэтэсы Валянціны Драбышэўскай.

Пра вывучэнне ўзбекскай літаратуры студэнтамі БДПУ імя М. Танка распавядала намеснік дэкана факультэта пачатковай адукацыі Ірына Буторына.

Выступіла таксама і пісьменніца з Казахстана, даўні сябар СПБ, даследчык беларуска-казахскіх літаратурных сувязей Святлана Ананьева, якая актыўна ўдзельнічала ў рабоце XXX ММКВК.

Ганаровыя госці і ўсе прысутныя з вялікай радасцю паслухалі і выступленне ансамбля народнай музыкі і песні «Менскі гармонік» пад кіраўніцтвам Івана Катовіча.

Работнікі бібліятэкі падрыхтавалі вялікую кніжную выстаўку, прымеркаваную да юбілею класіка ўзбекскай літаратуры. Была прадэманстравана і фотавыстаўка «Чароўны Узбекістан».

**Павел КУЗЬМІЧ**

# Плён пісьменніцкай працы

На галоўнай сцэне XXX Мінскай міжнароднай выставкі-кірмашу ў заключны дзень адбылася прэзентацыя кніг пісьменнікаў Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Старшыня аддзялення вядомы пісьменнік Міхась Пазнякоў пазнаёміў прысутных са шматпланавай дзейнасцю сталічнай арганізацыі як у творчасці, так і ў культурна-асветніцкай працы. Затым былі прэзентаваны калектыўныя зборнікі, прысвечаныя Году гістарычнай памяці: «Память — бяссмерце народа» (паэзія) і «Подых часу» (проза і публіцыстыка). Абодва ўклалі Міхась Пазнякоў і Тамара Кавальчук.

Адбылася і прэзентацыя трох зборнікаў твораў беларускіх і рускіх пісьменнікаў, падрыхтаваных аддзяленнем па выніках міжнароднага супрацоўніцтва. Гэта «Две сестры: Россия — Беларусь», «Четыре вечных времени» і «В стране фантазий». Апошні прысвечаны вядомаму рускаму пісьменніку Валерыю Мядзведзеву, стагоддзе з дня нараджэння якога адзначалася ў Расіі і Беларусі.

Затым свае кнігі прадставілі аўтары Аліна Грышкевіч, Валянціна Драбышэўская, Тацццяна Купрыянец, Анастасія Кузьмічова, Вольга Любашына, Кацярына Роўда, Уладзімір Мазго, Дзмітрый Мікалаеў, Настасся Каротчыкава, Зоя Кулік і многія іншыя творцы, а таксама кандыдаты ў члены СПБ Наталля Алейнікава і Алена Чаплінская.

**Павел КУЗЬМІЧ**

Кветка з літпалетка

# «Як ветразь даўніх зім і лет…»

**Згэтага дрэўца нашы продкі не рабілі нават крыжоў, яно — сімвал пяшчоты і прыгажосці, а таксама жаночай стойкасці і мужнасці. Здагадаліся, пра што размова? Вядома, пра бярозу!**

Шматлікія айчынныя пісьменнікі (як, дарэчы, і расійскія) асацыіравалі бярозу з пакутніцкім лёсам жанчын у гады вайны, часта згадвалі ў вершах ваеннай тэматыкі (у адным шэрагу з соснамі). Напрыклад, «Нашы бярозы» Уладзіміра Караткевіча:

*Танкі з крыжам ляцелі на лес празрысты.*
*Дым мяшаўся з зямлёю. Сцяліўся пажар.*
*Палала бярозка, танюткая, чыстая,*
*Без стогну,*
*Як Жанна д'Арк.*
*У дрэўцы, кволенькім, як мімоза,*
*Цякла зямлі маёй мужная кроў…*
*Я знаю, як гінуць нашы бярозы:*
*Без плачу.*
*Шапкі далоў!*

Але любоў да бяроз ніколі не абмяжоўвалася тэмай вайны: дрэва гэтае — адно з тых, да якога творцы звяртаюцца найчасцей і для стварэння вобразаў мірнага жыцця. Адным з найадметнейшых вершаў у зборніку У. Караткевіча «Мая Іліяда» з'яўляецца «Балада пра дзіка і чалавека», што пачынаецца радкамі:

*Ў ноч, як хвоі прастылыя выюць*
*І злятае шэрань з бяроз,*
*Дзік разрыў бурты бульбяныя*
*І ў курдобу пусціў мароз…*

Па сюжэце лірычны герой бярэ сабаку і ўночы ідзе паляваць на дзіка, на «сутычку і кроў». Мужчыну, вымушанага рызыкаваць, каб ператаваць аднавяскоўцаў, кепікамі праважае каханая — ён прагне любові і цеплыні, а атрымлівае здзеклівыя жарцікі… Урэшце ледзь не гіне сам, але забівае дзіка, які з'яўляецца ўвасабленнем мужнасці, няскоранасці, свабоды, неўтаймаванай прагі жыцця:

*Палазы рыпелі да вёскі,*
*І ў кароткай птушынай журбе*
*Гіль абтрос алмазы з бярозкі —*
*Як апошні прывет — на цябе.*

Фінальная сцэна твора сентыментальна-кранальная. Зрэшты, У. Караткевіч быў схільны да падобнага меладраматызму ў сілу свайго характару, надзвычайнай чуллівасці і душэўнай неабароненасці: каханая, ледзь жывая ад хвалявання, чакала свайго героя:

*Калацілася, што бярозка,*
*Як кране яе снегам сівым…*
*«Зоська, што ты? Чаго ты, Зоська?*
*Я ж з табой!.. Я жывы…»*

Цікавы факт: у працэсе падрыхтоўкі да друку рукапісу зборніка «Мая Іліяда» былі зняты 12 аўтарскіх прысвячэнняў, у тым ліку і прысвячэнне Анатолю Забалоцкаму, сябру У. Караткевіча па супрацы з «Беларусьфільмам», пад назвай згаданай балады. Вярнулі прысвячэнні ў перавыданні — «Мая Іліяда» ў аўтарскай рэдакцыі ўвайшла ў II том «Збору твораў» У. Караткевіча.

Адзін з найкранальнейшых вершаў пад назвай «Бярозка» належыць пяру Анатоля Вялюгіна. Верш стаў песняй: Ігар Лучанок напісаў мелодыю на гэтыя словы. Упершыню прагучала песня ў выкананні заслужанай артысткі БССР Тамары Раеўскай і была прысвечана першаму беларускаму касманаўту Пятру Клімуку, які скарыў касмічную прастору ў снежні 1973 года. У вобразе бярозкі адлюстравалася светлая шчымлівая туга аб незваротнай і найшчаслівейшай пары дзяцінства і ў той жа час неадольная прага зведаць далёкае, зазірнуць за мяжу звыклага:

*Стаіць, задумная, адна,*
*Як ветразь даўніх зім і лет.*
*Стаіць бярозка ля акна,*
*З якога мне адкрыўся свет.*

Звяртаюцца да вобраза дрэўца і сучаснікі. Здавалася б, дзе тут будзе час на падобныя сантыменты ў нашым



тэхналагічным шалёным стагоддзі, калі чалавек за дзень паглынае неверагодную колькасць бітаў інфармацыі… Але, магчыма, гэты звышхуткасны рытм толькі абвастрае душэўны сум па светлым і прыгожым. У вершы «Бярозавая варта» Пятра Жаўняровіча сузіранне прысад натхняе аўтара на глыбокі роздум:

*Два шэрагі раскідзістых бяроз*
*Гасцінец абступілі каля Вязыні.*
*Лістота маладая ў зязнні рос*
*Нібы праменнем зыркім перавязана.*

*Стаяць у дзве шарэнгі па баках.*
*Камлі бялеюць новымі мундзірамі*
*З чарненнем арганічным у мазках.*
*Унізе — лубін з кветкамі-сапфірамі.*

У свеце вядома каля 140 відаў бярозы (на латыні *Betula*), распаўсюджаны яны ў паўночным паўшар'і, а на Беларусі сустракаюцца толькі 4 з іх, прычым найчасцей — два: бяроза павіслая, ці барадаўчатая, і бяроза пушыстая. Радзей можна пабачыць карэльскую і карлікавую.

Бярозавае лісце і пупышкі багатыя на эфірны алей, флаваноідныя і іншыя рэчывы, надзвычай карысныя для чалавека. Але і ўсе іншыя часткі дрэва маюць шырокі спектр прымянення ў медыцыне, у тым ліку народнай: аказваюць мачагоннае, патагоннае, жаўцягоннае, супрацьзапаленчае і гарачкапаніжальнае ўздзеянне, здольны знізіць узровень цукру ў крыві, абязболіць, рэгулююць абменныя працэсы. Акрамя таго, на бярозе паразітуе грыб чага, які выкарыстоўваецца пры лячэнні анкалагічных захворванняў.

**Таша ШПАКОЎСКАЯ**
**Фота Пятра ЖАЎНЯРОВІЧА**

## зваротная сувязь

# Нечароўныя казкі

Канал «Культура» Беларускага радыё запрашае слухаць літаратурна-мастацкія і пазнавальныя праекты. Згодна з абноўленым раскладам, пачуць вершы беларускіх аўтараў у праекце «Адным штрыхом» можна тройчы на дзень. Раніцай і вечарам у праграме «Радыёсерыял» гучыць фантастычны раман Герберта Джорджа Уэлса «Чалавек-невідзімка».

Праграма «Літаратурная анталогія» гэтым разам прапануе старонкі рамана Івана Шамякіна «Крыніцы». У «Радыёбібліятэцы» двойчы на дзень слухайце твор Элізы Ажэшкі «Нізіны». Суботнім вечарам выходзіць праграма «Літаратурныя гісторыі», дзе гучаць апавяданні айчынных аўтараў.

У праекце «Прачулым радком» у выхадныя — вершы Генадзя Дзмітрыева.

Змест перадачы «Радыётэатр плюс» (пачатак эфіру ў 21.30) у суботу і нядзелю складуць дзве часткі радыёверсіі спектакля Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага «Знак бяды» паводле аповесці Васіля Быкава (да 70-годдзя з дня нараджэння акцёра, рэжысёра Валерыя Маслюка).

Юным прыхільнікам мастацкага вяшчання канал «Культура» прапануе з панядзелка да пятніцы чытанні ў межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя». Гэтымі днямі слухайце казкі з кнігі Васіля Шырко «Дзед Манюкін і ўнукі». У выхадныя ў перадачы «Дзіцячы радыётэатр» прагучаць спектакль «Як Мікітуля сяброў знайшоў» паводле твора Георгія Марчука і казка Францішка Багушэвіча «Як праўды шукаць», у нядзелю слухайце пастаноўку «Птушка-Праўда» паводле іспанскай народнай казкі і твор Віталія Біянкі «Як мурашка дадому спяшаўся». Штовечар у 21.00 «Вячэрняя казка» для маленькіх.

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў і зместам свежага нумара штотыднёвіка «ЛіМ». У нядзелю радыёверсія тэлеперадачы «Сураз-моўцы» пісьменніка, публіцыста Навума Гальпяровіча прапануе сустрэчу з доктарам філалагічных навук Людмілай Саянковай. Новы выпуск праекта «Літаратура на радыё» прагучыць у чацвер.

ЛіМ КАЛЯНДАР

**2 красавіка** — 95 гадоў з дня нараджэння Ліліі Брандабоўскай (1928—2021), беларускага тэатральнага крытыка.

**2 красавіка** — 90 гадоў з дня нараджэння Віктара Шымука (Вікенція; 1933—1998), беларускага паэта-песенніка, празаіка, перакладчыка.

**3 красавіка** — 85-годдзе адзначае Людміла Барташэвіч (1938), беларуская актрыса.

**3 красавіка** — 80-гадовы юбілей святкуе Уладзімір Рагаўцоў (1943), беларускі акцёр, заслужаны артыст БССР.

**4 красавіка** — 115 гадоў з дня нараджэння Ганны Базыленкі (1908—1980), беларускага мовазнаўца.

**4 красавіка** — 85 гадоў з дня нараджэння Вячаслава Кавалеўскага (1938—1997), беларускага мастака-лакатыста, афарміцеля.

**5 красавіка** — 80 гадоў з дня нараджэння Мар'яна Дуксы (1943—2019), беларускага паэта.

**6 красавіка** — 80-гадовы юбілей святкуе Міхаіл Зданевіч (1943), беларускі оперны спявак, педагог, заслужаны артыст БССР.

**7 красавіка** — 110 гадоў з дня нараджэння Максіміліяна Гугеля (1913—1985), беларускага графіка.

**8 красавіка** — 65-годдзе адзначае Пётр Прохараў (1958), беларускі жывапісец.

**Каляндар падрыхтаваны БДАМЛІМ**

**Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:**

**31 сакавіка** — у Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры (вул. М. Багдановіча, 13) на мерапрыемства, прысвечанае Дню яднання народаў Беларусі і Расіі з удзелам паэтаў МГА СПБ. Пачатак у 16.00.

**5 красавіка** — у паэтычны клуб «Парнас» пры публічнай бібліятэцы № 5 (вул. Казлова, 2) на творчую сустрэчу з паэтэсай Тамарай Кавальчук. Пачатак у 18.00.

**5 красавіка** — у Цэнтральную бібліятэку Цэнтральнага Дома афіцэраў на ўрачыстае ўручэнне літаратурных прэмій Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Пачатак у 16.00.

**5 красавіка** — у дзіцячую бібліятэку № 15 (вул. Слабадская, 27) на пасяджэнне студыі юных літаратараў «Малінаўскія галасы». Творчы кіраўнік — Іна Фралова. Пачатак у 16.00.

**6 красавіка** — у Дом дружбы (вул. Захарава, 28) на ўрачыстае падвядзенне вынікаў Міжнароднага літаратурнага конкурсу «Славянскі калейдаскоп». Пачатак у 15.00.

**Выходзіць з 1932 года**

**Заснавальнікі:**
**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»**

**Галоўны рэдактар**
**Аляксей Іванавіч ЧАРОТА**

**Рэдакцыйная калегія:**
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламедаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

**Адрас рэдакцыі:**
**Юрыдычны адрас:**
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

**Адрас для карэспандэнцыі:**
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

**Тэлефоны:**
галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі;
прозы і паэзіі ; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень
у пятніцу.

**Падпісныя індэксы:**
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны
для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Выдавец:**
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова
«Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар
Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ

Нумар падпісаны ў друк
30.03.2023 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 707

**Друкарня** Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013

Заказ — 521

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца у публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 23013